Государственное учреждение культуры
«Пинская районная централизованная библиотечная система»

# Панорама библиотечной жизни




Пинск, 2017


НАУКА БЕЛАРУСИ:
ИННОВАЦИИ И ТЕХНОЛОГИИ
2017–
Год
Науки
Первый съезд ученых Республики Беларусь
Олег Новицкий
КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА
Зарплата рядового депутата 1000 евро
КОГДА БЕЛОРУС НОВИЦКИЙ ВЕРНЕТСЯ ИЗ КОСМОСА, ЕГО МЛАДШАЯ ДОЧКА УЖЕ БУДЕТ ХОДИТЬ
ТОП-10
ФРАНЦЫСК СКАРЫНА




## *Уважаемые читатели,*
## *дорогие коллеги!*

*Закончился 2017 год. В Год науки мы уверенно двигались вперёд,
искренне радовались нашим успехам и победам,
много работали и нам есть чем гордиться.
Вместе с вами, уважаемые коллеги, каждый день мы делаем наши
библиотеки комфортнее для наших читателей.
Пусть 2018 год оправдает наши надежды и подарит всем
стабильность и уверенность в завтрашнем дне.*

А.И.Антошук
директор государственного
учреждения культуры
«Пинская районная
централизованная
библиотечная система»

# Анализ работы библиотек государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» за 2017 год

На 01.01.2018 года библиотечное обслуживание населения Пинского района осуществляли 39 библиотек: центральная районная библиотека имени Евгении Янищиц, Логишинская горпоселковая библиотека, 37 библиотек-филиалов, в том числе 1 библиотека-музей А. Блока, из них на неполный рабочий день работали 9 библиотек: 0,75 ставки – 1 библиотека, 0,5 ставки – 8 библиотек.

Количество читателей за отчётный период составило 26536 человек (104,5% от плана), из них 6378 детей, виртуальных – 4406. Им выдано 382152 документов (101,9% от плана), из них 247889 – в сельских библиотеках. Посещения составили 237022 (103,5% от плана), из них 132125 – в сельских библиотеках, 31953 – виртуальных.

Библиобус обслуживал 67 населённых пунктов. За 2017 год обслужено 503 читателя (в том числе детей – 90), выдано 7831 экз. литературы (в том числе детской – 709), посещений – 2531 (в том числе детей – 433), осуществлено 120 выездов, проведено мероприятий – 28.

Фонд библиотек государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» насчитывает 358 726 экземпляров документов. За 2017 год общее поступление в фонд составило 10542 экз., выбытие – 19721 экз. Таким образом, фонд уменьшился на 9179 экз. Показатель обновления фонда составил 2,9%. За отчётный период на комплектование фондов книгами из разных источников финансирования затрачено 9905,95 бел. рублей. Всего за 2017 г. из местного бюджета на закупку книг в количестве 184 экз. было выделено 1447,25 руб. (в т. ч. социально значимой литературы 138 экз. на сумму 1108,65 руб.). На книги и периодику из местного бюджета было выделено 71564,45, что составило 14,3% от общего финансирования.

В библиотеках насчитывается 61 компьютер (18 из них – в ЦРБ имени Евгении Янищиц), 46 принтеров, 33 сканера, 12 МФУ. В автоматизированном режиме ведется комплектование, учёт фондов, обработка и каталогизация, аналитика, регистрация и обслуживание читателей, краеведение в ЦРБ имени Евгении Янищиц. Количество библиографических записей в электронном каталоге составляет 68499.

В прейскурант платных услуг, которые библиотеки района оказывают населению, входит 31 вид наименований. За 2017 год оказано платных услуг на сумму 15840,30 руб., план – 15500,00 руб. Плановый показатель выполнен на 102,2%.

На 01.01.2018 года списочный состав работников в библиотеках государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» составил 94 человека, в том числе специалистов – 68, из которых 64,7% имеют библиотечное образование. Из специалистов высшее образование имеют 23 человека, в том числе библиотечное – 13, среднее специальное – 41, в том числе библиотечное – 31.

В библиотеках ведётся справочно-библиографическая и информационная работа. ПЦПИ функционирует в 13 библиотеках государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система»: ЦРБ имени Е. Янищиц, Логишинской ГпБ, Валищенской, Жидченской, Оховской, Плещицкой, Молотковичской, Оснежицкой, Парохонской, Новодворской, Пинковичской, Сошненской сельских библиотеках и Лопатинской библиотеке-музее А.Блока. ПЦПИ оснащён информационно-поисковой системой “Эталон”. За текущий период количество обращений к ИПС «Эталон» составило 489. За 2017 год услугами ПЦПИ воспользовалось 199 человек. Выполнено 489 справок. Обновление ПЦПИ осуществляется ежедневно. Общий фонд документов правовой тематики на 2017 год составляет 3267 экземпляров литературы, в том числе новые поступления в 2017 году – 57 экземпляров (51 экземпляр книг и 6 экз.

периодических изданий). В текущем году из периодических изданий правовой тематики поступал журнал «Право.by».

Основными направлениями работы библиотек государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» являются популяризация художественной и краеведческой литературы, духовно-моральное, патриотическое, экологическое, правовое воспитание, а также пропаганда здорового образа жизни.

С целью популяризации литературы библиотеками были подготовлены и проведены мероприятия к юбилеям белорусских писателей:

- к 500-летию белорусского книгопечатания библиотекари Логишинской ГпБ организовали мультимедийный обзор изданий "Францыск Скарына. Чалавек-легенда". В ЦРБ имени Е.Янищиц прошёл литературно-исторический экскурс "Францыск Скарына – духоўна-асветніцкі сімвал Беларусі". В Валищенской СБ состоялся праздник книги "Нас з'яднала слова". Присутствующие с удовольствием слушали сообщение о жизни и деятельности Ф. Скорины. Литературный час "У госці да Францыска Скарыны" состоялся в Сошненской СБ. В Пинковичской СБ прошел устный журнал "Блаславёныя Скарынай". Также библиотекари Пинковичской СБ организовали открытый просмотр литературы "Я свет адкрываю з кніжнай старонкі";

- к 135-летию со дня рождения Якуба Коласа в Пинковичском ЦСДК состоялся районный литературный праздник «Якуб Колас і Палессе», организованный сотрудниками ЦРБ имени Е.Янищиц. Библиотекарь Ковнятинской СБ провела литературную викторину «Жыццёвы і творчы шлях Я.Коласа». Вниманию читателей библиотеки была представлена книжная выставка «Пясняр зямлі беларускай». Читатели Оснежицкой СБ совершили виртуальное литературное путешествие «Шляхам Якуба Коласа». Литературно-музыкальная композиция «Пуцявінамі Якуба Коласа» прошла в Каменской СБ с сопровождением электронной презентации «Жыве слова Коласа». В Садовской СБ прошёл литературный час «Волат зямлі беларускай». Мероприятие сопровождалось книжной выставкой «Паклон прымі ад нас, пясняр!». Библиотекарь Домашицкой СБ организовала для своих читателей литературный вечер "Маці Беларусь, твой сын жыве!".

- к 135-летию со дня рождения Янки Купалы библиотекарь Каллауровичской СБ провела экскурс-путешествие "Купалавы словы як малітва" с сопровождением электронной презентации "Купала – сучаснік назаўжды". Читатели Поречской СБ приняли активное участие в конкурсе чтецов "Пясняр Беларусі". В Мерчицкой СБ состоялся час поэзии "Святло душы";

- к 105-летию со дня рождения М. Танка в Домашицкой СБ прошёл час поэзии "Вечнасці хваля ў жыцці народа". Библиографические обзоры литературы "Я сэрцам пісаў сваю кожную песню" и "Пад нарачанскім знакам" прошли в Озаричской и Каменской СБ.

Одно из главных направлений работы библиотек – краеведение, сохранение культурного и исторического наследия. Ведется поисковая и исследовательская работа в рамках районной целевой программы «Зямля бацькоў – жыцця крыніца». Проводятся встречи с талантливыми и творческими людьми Пинщины в ЦРБ имени Е.Янищиц: творческая встреча «Падарожжа ў чалавечае жыццё», посвящённая 70-летию Г.Марчука, презентация книги Е.Игнатюк «Будзе ўсё наадварот», вечер-встреча «На краешке души» с поэтессой Т. Кейта-Станкевич, литературный вечер «Мой шлях зямны», посвящённый поэтессе Пинщины Г.И.Лозицкой, презентация книги Марии Кобец «Палыновая квецень». В марте 2017 года в ЦРБ имени Е.Янищиц состоялось заседание клуба литераторов Пинщины «Пінчукі», посвящённое годовщине его создания «Клуб собирает друзей». Местные поэты прочитали свои стихотворения, пели, играли на гитарах.

Были проведены праздники деревень: д. Молотковичи «Мой край родной, ты сердцу дорог» (Молотковичская СБ), «Край родны, сэрцу дарагі» д. Озаричи (Озаричская СБ), «Деревенька моя» д. Семиховичи (ЦРБ имени Е. Янищиц совместно с автоклубом «Вестник»), «Моё село - ты песня и легенда» д. Кошевичи (Кошевичская СБ), «Милый сердцу уголок» д. Городище (Городищенская СБ), «Край родны, любая старонка…» д. Новый Двор (Новодворская СБ).

Библиотекари отмечают важность патриотического воспитания и проводят масштабную работу в этом направлении, используя весь арсенал форм и методов библиотечной деятельности. Ко Дню памяти воинов-интернационалистов состоялись следующие мероприятия: урок мужества «Былое в памяти не стёрто» (Валищенская СБ), час памяти «Рэха Афганістана» (Пинковичская СБ), час патриотизма «Афганский дневник» (Пучинская СБ), урок памяти «Горькая память афганской войны» (Садовская СБ).

С 1 по 9 мая в библиотеках проходила Неделя военной книги «Будем помнить всегда», в рамках которой состоялись мероприятия: литературно-музыкальная композиция «Великий май! Победный май!» (ЦРБ имени Е. Янищиц), заочная экскурсия «Пинщина в годы Великой Отечественной войны» (ЦРБ имени Е. Янищиц), акция «Чытаем кнiгi пра вайну» (Логишинская ГпБ).

Ко Дню Независимости Республики Беларусь в библиотеках состоялось множество мероприятий: познавательная программа «Люблю цябе, мой родны кут» (Купятичская СБ), литературно-музыкальная композиция «Белая, светлая, чыстая – маці мая Беларусь» (ЦРБ имени Е. Янищиц), выступление ЛПГ «Пралеска» «Зямля, што нам дадзена лёсам» (Каменская СБ).

Ко Дню Чернобыльской трагедии в библиотеках государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» был проведен ряд мероприятий: встреча с заместителем начальника отдела БОРБИЦ НИИ «Пожарной безопасности и проблем чрезвычайных ситуаций» МЧС Беларуси Н.Я. Борисевичем с сопровождением мультимедийной презентации «Чернобыль. Зона отчуждения» (ЦРБ имени Е.Янищиц), литературно-музыкальная композиция «Чарнобыль у беларускай паэзіі» (Каллауровичская СБ), урок-рассуждение «Помним ради будущего» (Кошевичская СБ), вечер памяти «Чарнобыль – звон напамінальны» (Каменская СБ), литературный час «Боль зямлі беларускай» (Плещицкая и Мерчицкая СБ).

Примерами ярких мероприятий по экологическому воспитанию и распространению экологических знаний стали час экологических знаний «Давайте с природой дружить» (Логишинская ГпБ), час информации «Звяры. Птушкі. Насякомыя» (Пинковичская СБ), экопраздник на природе «Прыроды вечнай чараванне» (Парохонская СБ), экологическое путешествие «Мы адчыняем тайны прыроды» (Новодворская СБ) ко Всемирному дню охраны окружающей среды; экологический праздник «Птушкі – сябры прыроды» (Стытычевская СБ), экопознавательный час «Мир пернатых» (Березовичская СБ), экокраеведческое путешествие «Птушкі роднага краю» (Почаповская СБ) к Всемирному дню птиц; час полезных сообщений «О братьях наших меньших» (Оховская СБ), эколитературная викторина «Эти разные животные» (Плещицкая СБ), познавательный час «Жывёльны свет Беларусі» (Каменская СБ), познавательное путешествие «Эти забавные животные» (Жидченская СБ) ко Всемирному дню охраны животных.

Разноплановая и интересная работа ведется по духовно-моральному воспитанию. Большое количество мероприятий проводилось ко Дню равноапостольного князя Владимира: час духовности «Креститель Святой Руси» (Лыщенская СБ), час православной культуры «Святы князь Уладзімір» (Пинковичская СБ), исторический урок «Гісторыя праваслаўя».

В библиотеках системы было проведено множество мероприятий к религиозным праздникам: фольклорные посиделки «Мир обновляется на Рождество» в рамках заседания любительского объединения «Ковчег» (Пинковичская СБ), библиотечные вечерки «Каля агню калядная свечкі» (Поречская СБ), литературно-музыкальная композиция «Пасха – свята надзеі і радасці» (ЦРБ имени Е.Янищиц), библиотечные вечерки «Нам поёт пасхальный звон» (Плещицкая СБ) к Светлому празднику Пасхи, урок духовности «Спасы провожай – осень встречай» в рамках заседания любительского объединения «Современница» (Садовская СБ), фольклорные посиделки «Пришёл Спас – яблочко припас» (Стытычевская СБ), литературно-поэтическая композиция «Мядовы Спас – усё пра запас» (ЦРБ имени Е. Янищиц), конкурс рисунков «Яблочко наливное» (Оснежицкая СБ) к празднику Спаса.

Состоялся ряд мероприятий ко Дню пожилых людей: программа-поздравление «Библиотека – пожилым людям» (Домашицкая СБ), урок милосердия «Когда старость – радость» (Березовичская СБ), библиотечные посиделки «Позвольте Вас теплом согреть» (Озаричская СБ), чествование лучших читателей на дому «Старость в радость» (Чуховская СБ).

В целях пропаганды здорового образа жизни к Международному дню отказа от курения во всех библиотеках проводился Единый день здоровья «Мы против курения». Среди самых интересных можно выделить: урок-рассуждение «Злой джин – табачный дым» (Пучинская СБ), познавательная викторина «Живи без сигарет!» (Городищенская СБ), беседа-диалог «Губительная сила сигареты» (Ставокская СБ), информационный час «Вред себе и обществу» (Новодворская СБ).

К Международному дню борьбы с наркоманией и наркобизнесом состоялась Неделя профилактики наркомании "Против зла вместе", которая сопровождалась мероприятиями различных форм: урок здоровья «Ради жизни и любви» (Оховская СБ), час рассуждения «Не отнимай у себя завтра» (Березовичская СБ), информационная беседа «Сохраним здоровье вместе» (Почаповская СБ), урок-предупреждение «Будучыня без наркотыкаў» (Каменская СБ).

Эффективной формой помощи библиотечным сотрудникам по-прежнему остаются семинары. В феврале организован районный семинар "Роля бібліятэкі ў зберажэнні народнай культуры і традыцый", на котором говорилось об исключительной роли библиотек в сохранении социокультурных традиций и роли библиотек в возрождении и сохранении народного наследия. По теме организации работы с детьми в период летних каникул на базе Оснежицкой СБ прошёл районный семинар "Дзіцячае чытанне сёння: праблемы, пошукі, вопыт". 23 июня на базе Валищенской СБ состоялся районный семинар "Библиотека – территория культуры". В июле на базе ЦРБ имени Е.Янищиц прошёл круглый стол "Деятельность ПЦПИ: опыт, проблемы, перспективы". Актуальные вопросы развития публичных центров правовой информации в районе обсудили участники круглого стола, библиотекари агрогородков на базе которых функционируют ПЦПИ. В ЦРБ имени Е.Янищиц для работников библиотек был проведён районный семинар "Творчыя дасягненні і перспектывы дзейнасці бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".

Состоялся районный смотр-конкурс " Нас слова паэта да творчасці кліча" на лучшее театрализованное мероприятие к 135-летию со дня рождения Я. Коласа. Победителями признаны: 1 место – Валищенская горпоселковая библиотека, 2 место – ЦРБ имени Е.Янищиц, 3 место – Лопатинская библиотека-музей А.Блока. За творческий подход, высокое исполнительское мастерство и артистизм участников грамотами и денежными премиями вознаграждены Парохонская и Бобриковская сельские библиотеки. В августе 2017 года прошел конкурс электронных презентаций "Познакомьтесь с библиотекой". Грамотами и денежными премиями вознаграждены: 1 место – Логишинская горпоселковая библиотека, 2 место – Кошевичская сельская библиотека, 3 место – Парохонская сельская библиотека. В номинации за «Высокий творческий и информационный уровень рекламы библиотеки» награждены дипломами 1, 2, 3 степени – Молотковичская, Садовская, Жидченская сельские библиотеки.

ЦРБ имени Е.Янищиц участвовала в XXV республиканском конкурсе "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры", по итогам которого среди библиотек в номинации "За падтрымку і развіццё чытання" заняла на республиканском уровне 3 место. Пинковичская сельская библиотека заняла первое место 1 место на республиканском уровне в конкурсе "Библиотека – центр духовного просвещения и воспитания" в номинации "Духовно-нравственное воспитание детей и молодежи".

Наиболее полному обеспечению культурно-просветительских требований наших пользователей содействует организация работы действующих при библиотеках любительских объединений и клубов по интересам.

В текущем году активно работают 67 объединений, в т.ч. 15 ЛПГ и 3 кукольных кружка.

Всего за 2017 год в библиотеках государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» проведено 1877 массовых мероприятий, в том числе на селе 1737.

Информация о мероприятиях библиотек регулярно размещается на сайте центральной районной библиотеки имени Евгении Янищиц. Освещается работа библиотек на ТРК «Варяг», ТРК «Пинск», «Белтелерадиокомпании «Брест», в 2017 году непосредственно сюжеты прошли 8 раз. В газетах деятельность библиотек сети освещалась 43 раза: «Народная трыбуна», "Полесская правда", "Пинский вестник", "Варяг-пресс", "Сельская газета", "Бібліятэчны свет", "Вечерний Брест", "Бібліятэка прапануе". Библиотеки района работают в тесной связи с общественностью: районной газетой, телевидением, учреждениями образования, в том числе и дошкольными, клубными учреждениями, церквями и другими организациями.

**Новые наработки в течение года. Проблемы. Предложения**

По всем направлениям библиотечных показателей коллектив сработал положительно. Достигнуто это было благодаря качественному и оперативному обслуживанию населения. На более высоком профессиональном уровне стали оформляться книжные выставки, проводиться массовые мероприятия библиотеки, чему содействовало проведение районных семинаров и смотров-конкурсов.

Новый 2018 год знаменателен юбилеями белорусских писателей и поэтов, уроженцев Пинщины, таких как Евгения Янищиц, Валерий Гришковец, Николай Еленевский, Тамара Лознюха, Алексей Ненадовец, Любовь Тарасюк, жизнь и творчество которых стали значительным вкладом в белорусскую культуру. Сотрудниками ЦРБ имени Е.Янищиц будут организованы мероприятия, приуроченные к этим знаменательным датам. В рамках Недели популяризации творчества Евгении Янищиц «Янішчыцкі лістапад» состоится районный праздник поэзии «Непрыручаная птушка Палесся». В ЦРБ пройдут творческий вечер "Я из тех…" к 65-летию со дня рождения Валерия Гришковца, литературный вечер "Слово, обращённое в вечность" к 70-летию со дня рождения Николая Еленевского, вечер-встреча "Свет далёкай мінуўшчыны" к 60-летию со дня рождения Алексея Ненадовца.

Также сотрудники библиотеки и литераторы рассмотрели возможность проведения творческих встреч с местными литераторами. Например, в будущем году состоится вечер поэзии Зинаиды Савило «Вся жизнь моя в стихах», вечер бардов Пинщины «Над хваляй Піны ўсхваляваныя», творческий вечер поэта Василия Олешко из д. Молотковичи «Яго лёс – вершы» и встреча с краеведом Татьяной Хвагиной.

Перспектива развития библиотек направлена на выполнение плановых показателей, формирование информационных ресурсов, совершенствование системы информационно-библиотечного обслуживания населения, создание условий для укрепления и развития материально-технической базы библиотек и библиотечного дела.

**Награждение лучших сотрудников**

**Профессиональные достижения сотрудников библиотек были отмечены:**

**Дипломом III степени Министерства культуры Республики Беларусь:**
ЦРБ имени Евгении Янищиц;

**Благодарностью Пинского районного исполнительного комитета:**
Сак Н.В., главный библиотекарь отдела комплектования, обработки и организации единого фонда ЦРБ имени Е. Янищиц;

**Грамотой Пинской районной организации Республиканского общественного обьединения «Белая Русь»:**
Попитич Л.И., главный библиотекарь отдела библиотечного маркетинга;
Лосич С.П., зав. Парохонской СБ;

**Грамотой отдела идеологической работы, культуры и по делам молодёжи:**
Гут А.М., заведующая отделом комплектования, обработки и организации единого фонда ЦРБ имени Е. Янищиц;
Додонова Н.М., библиотекарь 1-й категории отдела комплектования, обработки и организации единого фонда ЦРБ имени Е. Янищиц;
Костюк Т.П., библиотекарь 1-й категории Почаповской СБ;
Мосейчук Н.Р., библиотекарь 2-й категории Жидченской СБ;
Водчиц В.С., библиотекарь 2-й категории Парохонской СБ;
Михалевич Е.Н., библиотекарь 2-й категории Бобриковской СБ;
Громада А.А., библиотекарь 2-й категории Садовской СБ;
Шпаковский В.И., художник-оформитель ЦРБ имени Е. Янищиц;
Бощук Г.А., библиотекарь Поречской СБ;
Жуков Н.П., научный сотрудник Лопатинской библиотеки-музея А. Блока;
Марчук Е.Ю., библиотекарь 2-й категории Каллауровичской СБ.






# УДЗЕЛ У РЭСПУБЛІКАНСКІМ КОНКУРСЕ “БІБЛІЯТЭКА-АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ”

Падтрымка і развіццё чытання – стратэгічна важны элемент культуры Рэспублікі Беларусь. Цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц на працягу свайго існавання выконвае місію культурнага пасярэдніцтва паміж чытачамі і друкаванай прадукцыяй, садзенічае падтрымцы і развіццю чытання.

Бібліятэка ў сваім развіцці прайшла складаны і цікавы шлях, мае шмат цікавых набыткаў, дасягненняў і традыцый, унесла вялікі ўклад у справу фарміравання і развіцця культуры Піншчыны, далучэння яго жыхароў да лепшых узораў сусветнай і айчыннай літаратуры.




Гісторыя бібліятэкі пачалася ў далекім 1945 годзе. На жаль дакументаў, якія б пацвердзілі дату заснавання бібліятэкі, не аказалася ў архівах Пінска і Пінскага раена. Упершыню цэнтральная раённая бібліятэка ўпамінаецца ў рашэнні выканкама Пінскага райсавета дэпутатаў працоўных ад 20 мая 1945 года “Об исполнении местного бюджета Пинского района за 1 квартал 1945 года”.

Бібліятэка мела 400 чытачоў. У кніжным фондзе пераважала літаратура палітычнага характару, не хапала мастацкай літаратуры, на якую быў вялікі попыт. Пінская раенная бібліятэка да 1948 года не мела свайго памяшкання.

У 1950-1952 гг. бібліятэка займала адзіны пакой плошчай 32 кв. м. у раённым Доме культуры. У той час супрацоўнікі бібліятэкі імкнуліся прывабіць як мага больш чытачоў. З гэтай мэтай у вёсках раёна адчыняліся пункты выдачы літаратуры.

У 60-я гады бібліятэка знаходзілася ў памяшканні па вуліцы К. Маркса. Паступова раенная бібліятэка становіцца метадычным цэнтрам для масавых бібліятэк раена і культурным – для жыхароў раёна і горада.

У пачатку 70-х гадоў бібліятэка мела ў сваім штаце 5 чалавек. У 1978 г. была арганізавана Пінская цэнтралізаваная раённая бібліятэчная сістэма. Дзякуючы цэнтралізацыі бібліятэка стала цэнтральнай раеннай, змянілася яе структура і штатны расклад. Былі арганізаваны новыя аддзелы. Колькасць работнікаў павялічылася амаль ў 5 разоў. На сённяшні дзень у бібліятэцы функцыянуюць 3 аддзелы: аддзел бібліятэчнага маркетынгу, аддзел камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонда і аддзел абслугоўвання і інфармацыі.



Цэнтральная раенная бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц адно з любімых месц правядзення вольнага часу жыхароў горада і раёна. Сёння для 4000 чытачоў бібліятэка з'яўляецца інфармацыйным, адукацыйным і культурна-асветніцкім цэнтрам. Універсальны па зместу кніжны фонд налічвае 51202 экзэмпляра кніг. Бібліятэка валодае буйнейшым зборам краязнаўчых і мясцовых выданняў.



Штогод у яе сценах праходзіць больш за 70 мерапрыемстваў: прэзентацыі кніг, святы паэзіі, літаратурна-музычныя кампазіцыі, агляды-конкурсы… Бібліятэка – цэнтр прыцягнення культурных сіл раёна. Да супрацоўніцтва запрашаюцца краязнаўцы, мастакі, пісьменнікі і паэты…

На працягу многіх гадоў шмат зроблена для таго, каб бібліятэка стала сапраўдным асяродкам беларускай культуры.

Багаты даведачна-бібліяграфічны апарат уключае сістэму каталогаў і картатэк. Бібліятэка фарміруе інфармацыйную культуру сваіх чытачоў, пашырае спектр паслуг.

У холе бібліятэкі можна пазнаеміцца з самай разнастайнай інфармацыяй.

Светлае і прасторнае памяшканне абанементу, прыгожая і утульная чытальная зала – робяць бібліятэку больш прывабнай і камфортнай як для карыстальнікаў, так і для працы супрацоўнікаў.




Для кніжных выстаў характэрна навізна і актуальнасць.

Мэта бібліятэкі – паказаць каштоўнасць кнігі, расказаць аб ёй так, каб з'явілася жаданне ўзяць яе у рукі, і, акрамя таго, стварыць камфортныя умовы для карыстальнікаў.

Бібліятэка стала своеасаблівым метадычным цэнтрам для 38 сельскіх бібліятэк. Супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу для работнікаў

сельскіх бібліятэк праводзяць семінары, практыкумы, круглыя сталы, якія накіраваны на падтрымку і развіццё чытання, папулярызацыю творчасці пісьменнікаў, павышэнне культуры чытання.

Цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц аўтаматызавана ў поўным аб'ёме. У аўтаматызаваным рэжыме вядзецца камплектаванне, улік фондаў, апрацоўка і каталагізацыя, аналітыка, рэгістрацыя і абслугоўванне чытачоў і краязнаўства.

Вынікова выступае калектыў бібліятэкі ў раённых конкурсах. Неаднаразова яму прысуджалі ганаровыя месцы. Так, калектыў стаў пераможцам у раённым аглядзе-конкурсе "Библиотечная выставка – средство рекламы книги и чтения", "Подзвіг жыве ў вяках". У раённым аглядзе-конкурсе на лепшы летапіс сваёй вёскі "Зямля, дзе пачаўся твой лёс" аддзелу абслугоўвання і інфармацыі было прысуджана 2-е месца.

Асноўнымі накірункамі дзейнасці цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц з'яўляюцца папулярызацыя мастацкай і краязнаўчай літаратуры, духоўна-маральнае, патрыятычнае, экалагічнае, прававое выхаванне, а таксама прапаганда здаровага ладу жыцця.



Штогод ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц праходзяць абласны месячнік папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі”, тыдзень папулярызацыі творчасці Я. Янішчыц “Янішчыцкі лістапад”, тыдзень ваеннай кнігі, тыдзень прафілактыкі наркаманіі, тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі.

Традыцыйна праходзяць выступленні ЛПГ: “Квітней, Беларусь”, “Старонка мая светла-русая”, “Мілы сэрцу куток”, “Беларусь – мая гордасць і слава”, “Я тут свая і болей анічога…”, прысвечанае 66-й гадавіне з дня нараджэння Я. Янішчыц, "И снова май, цветы, салют и слёзы" у весках Беразцы і Маладзельчыцы да свята Перамогі, “Славим возраст золотой” прайшло ў в. Тырвовічы і ў сястрынскім аддзяленні Лемяшэвіцкай участковай бальніцы, “Сагрэе душу дабрыня”.



Папулярызацыя здаровага ладу жыцця з’яўляецца адным з самых актуальных напрамкаў у рабоце бібліятэкі. Каардынíруючы сваю дзейнасць з установамі культуры і адукацыі, медыцынскімі ўстановамі, бібліятэкары выкарыстоўваюць комплекс мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць фарміраванню здаровага ладу жыцця, актыўнай жыццёвай пазіцыі, прафілактыцы шкодных звычак. Сярод самых значных мерапрыемстваў можна адзначыць: час трывогі “Имя беды – наркотик», на якім выступіла настаўніца біялогіі Шалтанюк Л.В., адкрыты дыялог з навучэнцамі індустрыяльна-педагагічнага каледжа “Курить. Есть о чём подумать”, Дзень здароўя “Выбери жизнь”, выступленне ЛПГ “Светач” у вёсцы Тырвовічы з кампазіцыяй “Здоровым быть – в радости жить”.

На працягу сваёй дзейнасці бібліятэка праводзіць работу па патрыятычнаму выхаванню насельніцтва. У цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц па дадзенаму напрамку адбыліся інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Моя Родина и ее основной закон”, на якім прысутныя змаглі пачуць пра Беларусь, пра Канстытуцыю, ЛПГ «Светач» цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я. Янішчыц напярэдадні 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне выступілі з літаратурна-музычнай кампазіцыяй «Памяць сэрца»



перад жыхарамі вёсак Невель і Семіхавічы, да Дня памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны адбылося выступленне ЛПГ “Светач” для жыхароў в. Вулька-Лаўская “Время и память”. Гісторыя Палесскага краю багатая падзеямі і імёнамі, непаўторна сваёй гісторыяй, цікавымі і таленавітымі людзьмі. Разумеючы гэта, бібліятэка прыкладае ўсе намаганні для захавання традыцый чытання, яго падтрымку і развіццё, ушанавання імён знакамітых землякоў, папулярызацыі іх творчасці.

Усе мерапрыемствы гэтага накірунку прасякнуты павагай і любоўю да знакамітых землякоў. Бібліятэка з вялікім гонарам носіць імя праслаўленай беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц. Як след каметы, як зорачка на небасхіле, праляцела жыццё Я. Янішчыц, якое было служэннем роднай Беларусі, якую яна бясконца любіла.



У бібліятэцы адкрыта літаратурна-музычная гасцёўня, дзе размясцілася фотавыстава аб яе жыцці і творчасці.

Было выдана сем паэтычных зборнікаў паэтэсы: “Снежныя грамніцы”(1970), “Дзень вечаровы” (1974), “Ясельда” (1978), “На беразе пляча”(1980), “Каліна зімы”(1987), “Пара любові і жалю”, “У шуме жытняга святла”(1988). У 2016 годзе пабачыў свет першы том зборніка “Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі.”

На стэндах гасцёўні наведвальнікі могуць пазнаеміцца з тытульнымі лістамі гэтых зборнікаў. Талент паэтэсы прызналі калегі па пяру – Пімен Панчанка, Ніл Гілевіч, Алег Лойка, Генрых Далідовіч. Фатаграфіі сустрэч Яўгеніі Янішчыц з паэтамі ў розныя гады таксама размешчаны на стэндзе.



У даведачнай службе чытачы могуць пазнаёміцца з літаратурай аб жыцці і творчасці паэтэсы, карыстаючыся картатэкай “Крылы паэзіі Яўгеніі Янішчыц”.

Штогод у бібліятэцы з 20 па 25 лістапада, як і ва ўсіх бібліятэках дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, праходзіць Тыдзень папулярызацыі творчасці Яўгеніі Янішчыц “Янішчыцкі лістапад”. На працягу свайго існавання бібліятэка актыўна праводзіць работу па прапагандзе творчасці знакамітай зямлячкі.

У 2014 годзе літаратурна-паэтычная група “Светач” пры ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц выступіла з кампазіцыяй “Я тут свая і болей анічога…”, прысвечанай 66-й гадавіне з дня нараджэння Я. Янішчыц на малой радзіме паэтэсы – у вёсцы Велясніца.

Урачыстае мерапрыемства, літаратурна-музычная кампазіцыя «Была ў душы я весняй…”, прысвечаная дню нараджэння Я. Янішчыц адбылася ў чытальнай зале ЦРБ імя Я. Янішчыц 20 лістапада 2015 года.



2016 год стаў асаблівым для ўсіх прыхільнікаў творчасці знакамітай зямлячкі. У ЦРБ імя Я. Янішчыц адбылася важная падзея – прайшла прэзентацыя першага тома чатырохтомнага выдання «Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі». На мерапрыемстве дзяліліся ўспамінамі блізкія да паэтэсы людзі. Сын Андрэй расказаў прысутным аб тым, якой ён запомніў сваю маму. Пажадалі расказаць пра Яўгенію Янішчыц яе пляменніца Т. Ганчарык, стрыечная сястра Р. Баран. Таксама на мерапрыемтсве прысутнічалі прыхільнікі творчасці Я. Янішчыц: члены клуба літаратараў Піншчыны «Пінчукі»: М. І. Ляшук, Т. Кейта-Станкевіч, В. Грышкавец, А. Шушко, Г. Лазіцкая, З. Савіла, Л. Шклёда, В. Алешка, Л. Кучынская, Ж. Завацкая, А. Ільін.

Паэтэса рана пайшла з жыцця, але назаўжды засталася ў літаратуры, у людской памяці. Паэзія душы, кахання, асабістых успамінаў заўсёды будзе мецц свайго чытача. А імя Яўгеніі Янішчыц застанецца ў памяці кожнага, хто хоць раз у жыцці адкрываў зборнік яе вершаў.

Цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц на працягу свайго існавання ставіць перад сабой задачы па фарміраванню спрыяльнага для прадвіжэння чытання інфармацыйнага асяроддзя, прадвіжэнню лепшых узораў літаратуры ў шырокія пласты




насельніцтва Піншчыны, а таксама папулярызацыі творчасці літаратараў Палесся. І менавіта, зыходзячы з дадзеных задач, бібліятэка значную ўвагу надае развіццю літаратурнай творчасці мясцовых літаратараў, папулярызіруе іх творчасць, займаецца прадвіжэннем іх твораў.



У чытальнай зале ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц прайшла прэзентацыя зборніка вершаў Сяргея Жылевіча, таленавітага мастака, скульптара і паэта пад назвай «Сто листов из книги бытия». Яго імя добра вядома не толькі на Піншчыне, але і за мяжой. Сяргей Фёдаравіч шмат працуе і шмат выстаўляецца. У яго ёсць яшчэ адзін дар – пісаць вершы. Вершаваныя «ілюстрацыі» да скульптур, роздумы аб жыцці – аснова зборніка «Сто листов из книги бытия». На мерапрыемстве ў адрас мастака гучала шмат цёплых слоў і пажаданняў. Са словамі падзякі і віншаваннямі ў яго адрас выступіла краевед Таццяна Хвагіна. Мясцовы паэт Анатоль Шушко пажадаў аўтару новых дасягненняў на паэтычнай сцязе. З парадай на напісанне новых зборнікаў выступіў яго калега мастак Руслан Дар’ін. Мерапрыемства суправаджалася мультымедыйнай прэзентацыяй, таксама былі прадэманстраваны відэаролікі аб творчасці мастака і паэта. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава "Живописец, скульптор и поэт Сергей Жилевич".

ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц у лістападзе 2015 года прыняла актыўны ўдзел у абласным месячніку папулярызацыі нацыянальнай мастацкай літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі”, пад час якога адбылася прэзентацыя кнігі “Очерки истории культуры Пинщины (IX - начало XX веков)”, якая выдадзена ў рэдакцыйна-выдавецкім аддзеле Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтарамі сталі Аляксандр Ільін і Алена Ігнацюк, выкладчыкі ўніверсітэта. Аляксандр Львовіч – дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій, яго жонка Алена Аляксандраўна – дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права. Павіншаваць Аляксандра Львовіча з выхадам кнігі прыйшлі выкладчыкі і студэнты ПалесДУ, мясцовыя паэты, з канцэртнай праграмай выступілі музыканты Пінкавіцкай дзіцячай школы мастацтваў.




На працягу многіх гадоў бібліятэка супрацоўнічае, падтрымлівае шчырыя, сяброўскія адносіны з таленавітым самабытным паэтам Анатолем Шушко. “Гучыць слова земляка над роднаю старонкай” – пад такой назвай прайшла літаратурна-музычная імпрэза, прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння пісьменніка. Анатоль Іванавіч, многа гаварыў аб сваей паэзіі, творчых пошуках, чытаў свае новыя вершы. Шмат гасцей (62 чал.) знакамітых, творчых людзей Піншчыны, супрацоўнікаў бібліятэк раена, блізкіх і родных людзей паэта прыйшло ў раенную бібліятэку, каб павіншаваць Анатоля Шушко з яго юбілеем. Першым да мікрафона быў запрошаны паэт Валерый Грышкавец, які ад усей душы гаварыў словы віншавання свайму сябру, шмат шчырых і цеплых слоў пачуў Анатоль Іванавіч ад журналісткі Марыі Ляшук, паэта, краязнаўца Міхаіла Башчука, мастака Сяргея Жылевіча, журналіста Паўла Куніцкага, паэта-барда Мікалая Жукава, паэта Уладзіміра Зянюціча. Кранула ўсіх прысутных выступленне бацькі паэта Івана Шушко, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. Мерапрыемства прайшло ў надзвычай цеплай і шчырай атмасферы. Кніжная выстава ”Ляці, мой верш, заўжды да небакраю!..” пазнаеміла прысутных са зборнікамі вершаў знакамітага земляка і літаратуры аб ім.



З павагай адносяцца супрацоўнікі бібліятэкі да памяці сваіх славутых землякоў, якія праславілі наш край. Так, у гасцёўні ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц прайшоў вечар-успамін “Я вернусь туда, где туманы і росы…”, прысвечаны 70-годдзю эколага і краяведа Аляксея Дуброўскага. Тут сабраліся тыя, хто яго блізка знаў, каму былі цікавы яго даследчыя матэрыялы аб родным краі, аб гісторыі і прыродзе Пінскага Палесся, культуры і традыцыях палешукоў. Калегі, сябры, аднадумцы дзяліліся ўспамінамі аб гэтым неардынарным чалавеку. Ён быў сапраўдным знаўцам палескай прыроды, умелым правадніком па запаветным куточкам. Аляксей Мікалаевіч адным з першых стаў экскурсаводам, лаўрэатам конкурсу “Пазнай Беларусь”.

Вынікам вечара-успаміна стала прапанова заснаваць штогодні краязнаўчы конкурс імя Аляксея Дуброўскага на лепшы фотаздымак ці даследчую работу. Гэту ідэю выказала вядучая мерапрыемства старшыня Пінскага аддзялення беларускага аб’яднання экскурсаводаў Таццяна Хвагіна. Да мерапрыемства была афармлена кніжная выстава “Любоў і боль яго - Палессе”, дзе прысутныя маглі пазнаёміцца з багатым матэрыялам, які маецца ў бібліятэцы аб жыцці і творчасці гэтага цудоўнага чалавека.

Заўсёды вельмі прыемна дакрануцца да жывога паэтычнага слова, прыадчыніць дзверы ў свет, напоўнены рамантычнай вобразнасці пачуццямі. Асабліва ў поўнай меры гэта адчулі чытачы і супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц, якія прысутнічалі на вечары-партрэце "Палявая кветка табульскай прыволлі", прысвечаным 60-годдзю з дня нараджэння нашай зямлячкі, пісьменніцы і журналісткі Марыі Іванаўны Ляшук.



Марыя Іванаўна добра вядомая на Брэстчыне і як таленавіты паэт-лірык, і як аўтар цудоўных «жаночых» аповесцяў. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член праўлення Брэсцкага аддзялення пісьменнікаў, друкуецца ў часопісах "Гаспадыня", "Нёман", "Алеся", "Маладосць", газетах "7 дней", "Рэспубліка", "Народная трыбуна", "Заря", "Полесская правда", "Пінскі веснік", калектыўным альманаху "Гоман". У 2007 годзе ў Пінскай рэгіянальнай друкарні была выдадзена яе кніга прозы і паэзіі «Благословенные небом». Вядучыя пазнаёмілі прысутных з жыццём і творчасцю пісьменніцы. Затым слова было прадастаўлена Марыі Іванаўне, дзе яна распавяла аб сваіх творах, творчых пошуках і планах. Шмат гасцей, чытачоў, творчых людзей Піншчыны прыйшлі ў бібліятэку павіншаваць Марыю Іванаўну. Добрыя і цеплыя словы пачула яна ад паэта, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі А. І. Шушко, паэта-краязнаўцы Міхаіла Башчука, паэткі Марыі Кобец, Т. Кейта-Станкевіч, Ж. Завацкай, Л. І. Кучынскай, Н. Р. Палавец. Яны чыталі свае вершы, прысвечаныя М. Ляшук, жадалі моцнага здароўя і творчых поспехаў. Мерапрыемства прайшло ў надзвычай цеплай і шчырай атмасферы. Кніжная выстава ”Залатое пяро Марыі Ляшук” пазнаеміла прысутных з творамі знакамітай зямлячкі і літаратурай аб ёй.

На базе Лапацінскай бібліятэкі-музея А. Блока адбыўся раённае свята паэзіі, прысвечанае дзвум юбілейным датам – 135-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага паэта Аляксандра Блока і 35-годдзю заснавання музея яго імя. На Палессе стала ўжо добрай традыцыяй праводзіць мерапрыемствы ў памяць пра вялікага паэта. І гэта невыпадкова, таму што тут А. Блок правёў больш паўгода – са жніўня 1916-га па сакавік 1917 года. Паэт пабываў у Парахонску, Колбах, Лапаціна.



На свята паэзіі ў Лапаціна памкнуліся вядомыя пінскія літаратары Валерый Грышкавец, Анатоль Шушко, Марыя Ляшук, Марыя Кобец, Галіна Лазіцкая, Тамара Кайта-Станкевіч, скульптар і мастак Сяргей Жылевіч, працаўнікі культуры, якія стаялі ў вытокаў стварэння музея Блока, супрацоўнікі раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, мясцовыя жыхары, школьнікі.

Навуковы супрацоўнік бібліятэкі-музея Мікалай Жукаў расказаў пра гісторыю стварэння ўстановы. Ініцыятарам стварэння музея А. Блока быў маскоўскі навуковец, журналіст, даследчык жыцця і творчасці А. Блока
Георгій Блюмін. Асноўная заслуга ў тым, што музей стварыўся, прыналежыць найстарэйшаму музейнаму працаўніку Піншчыны Фёдару Жураўскаму. Некалькі гадоў ён вёў шырокае ліставанне з літаратурнымі музеямі краіны, архівамі, даследнікамі творчасці А. Блока, у выніку чаго сабраў каля 300 экспанатаў, якія і склалі экспазіцыю музея. Паступова музей атрымаў вялікую слыннасць, штогод у ім праводзіліся Блокаўскія святы паэзіі. Частымі гасцямі музея былі вядомыя літаратары Беларусі: С. Грахоўскі, Я. Янішчыц, С. Законнікаў, М. Федзюковіч. Актыўны ўдзел у станаўленні музея прымалі



пінскія паэты В. Грышкавец, А. Бібіцкі, З. Вагер, А. Шушко, Л. Дзікавіцкая і іншыя.

Пасля наведвання музея гасцей свята чакала тэматычная праграма, прысвечаная жыццю і творчасці А. Блока. Літаратурнае свята адкрыў старшыня Лапацінскага сельвыканкама А. Мойсеянчик. Экскурс у гісторыю стварэння музея зрабілі Д. Лемяшэўскі і Р. Крывіцкая. Увазе гасцей быў пададзены таксама дакументальны фільм «Аляксандр Блок».

## КЛУБ ЛІТАРАТАРАЎ ПІНШЧЫНЫ “ПІНЧУКІ”

Цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц з’яўляецца культурным і інфармацыйным цэнтрам Пінскага раёна, тут збіраюцца таленавітыя людзі Піншчыны розных прафесій, позіркаў і ўзросту. Творчасць як вядомых літаратараў Піншчыны, сярод якіх Валерый Грышкавец, Анатоль Шушко, Марыя Ляшук, Марыя Кобец, так і пачынаючых аўтараў цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц на сённяшні дзень імкнецца максімальна папулярызаваць, падтрымліваць і развіваць.

2016 год стаў асабліва важным у дзейнасці бібліятэкі, з нагоды таго, што бібліятэка аб'яднала пісьменнікаў і паэтаў Пінскага краю, стварыўшы доўгачаканую суполку – клуб літаратараў Піншчыны. Стварэнне аб'яднання літаратараў было неабходна як пачынаючым, так і знакамітым пісьменнікам і паэтам Пінскага Палесся. Рашэнне аб адкрыцці клуба літаратараў Піншчыны пры цэнтральнай раённай бібліятэцы было прынята яшчэ ў 2015 годзе. Афіцыйнае адкрыццё клуба літаратараў Піншчыны адбылося ў сакавіку 2016 года ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц.

Гэта адкрыццё сімвалічна і своечасова менавіта ў Год культуры, таму што яно дае новы імпульс для творчасці як вядомых, так і пачынаючых аўтараў Палесскага краю, пашырае магчымасць для сустрэч з чытачамі, садзейнічае знаёмству апошніх з прозай і паэзіяй сваіх талентавітых землякоў. Па задуме арганізатараў, працаўнікоў бібліятэкі, клуб літаратараў неабходны таленавітым людзям. Супольна яны змогуць абмяркоўваць свае творы, дзяліцца вопытам, займацца прадвіжэннем сваіх ідэй.

*ВЕСНАВОЕ*

*Годам вісакосным,*
*З веснавой рукі,*
*Заснаваны кросны*
*Гурту "Пінчукі".*

*Ясельда паводкай*
*Крые берагі.*
*Марывам дрыготкім*
*Сцелюць звон лугі.*

*Дзе расістым ранкам*
*Сцежка пралягла –*
*То вясна з каханнем*
*Подручкі прайшла.*

*Весняць наваколле*
*Песні – жаўрукі...*
*Хай люляе доля*
*Гурт наш "Пінчукі"!*

*Міхаіл Башчук*

З адкрыццём клуба літаратараў прысутных павіншаваў намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі С. В. Падшывалаў.



Плёну ў працы, новых прыхільнікаў і аматараў літаратурнага слова, творчага натхнення пажадала дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” А. І. Анташук. Кожны з прысутных літаратараў меў магчымасць прачытаць перад шматлікай аудыторыяй свае творы, было дадзена слова і пачынаючым паэтам. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ляшук Марыя Іванаўна выказала падзяку маладым аўтарам за тое, што яны прыйшлі на сустрэчу і падзяліліся сваімі творамі. Да адкрыцця клуба пісьменнікаў была падрыхтавана кніжная выстава “Паэтычныя галасы Піншчыны”.

Клуб літаратараў Піншчыны “Пінчукі” збіраецца кожную апошнюю пятніцу месяца. Амаль усе мерапрыемтвы бібліятэкі сталі полем дзейнасці клуба. Члены суполкі з’яўляюцца ўдзельнікамі ўсіх урачыстых мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю творчасці пісьменнікаў.

ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА “МЕЛОДЫІ ЯЕ ДУШЫ…”

Сімвалічная творчая сустрэча “Мелодыі яе душы…” з талентавітай зямлячкай, паэтэсай Марыяй Кобец прайшла ў сакавіку ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц. Сімвалічная менавіта таму, што сустрэча з сябрамі і прыхільнікамі адбылася ў Сусветны дзень паэзіі. Марыя Уладзіміраўна – член Саюза пісьменнікаў Беларусі,



вядомая сваімі пяшчотнымі лірычнымі творамі, аўтар зборніка “Кроплі”, займаецца перакладамі з сербскай, туркменскай, таджыкскай, украінскай моў. На творчую сустрэчу з паэтэсай у бібліятэку прыйшлі яе бацькі, родныя, сябры, члены клуба пісьменнікаў і проста прыхільнікі яе таленту. Вядучыя пазнаёмілі з жыццёвым і творчым лёсам Марыі Уладзіміраўны. З пажаданнямі творчых поспехаў адкрыў мерапрыемства намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Падшывалаў С.В. Шмат шчырых і цёплых слоў, творчых пажаданняў пачула Марыя Уладзіміраўна ад сваіх настаўнікаў, таварышаў па пяру В. Ф. Грышкаўца і А. І. Шушко. Нямала добрых слоў было сказана ў адрас Марыі Уладзіміраўны ад таленавітай пісьменніцы і журналісткі М. І. Ляшук. З захапленнем ўсе слухалі выступленне самой Марыі Уладзіміраўны. У выкананні аўтара прагучалі новыя, невядомыя шырокай публіцы творы.

## ПРЭЗЕНТАЦЫЯ КНІГ МІКАЛАЯ ВАСІЛЬЕВІЧА ЕЛЯНЕЎСКАГА «РАДКІ, НАПІСАНЫЯ СЭРЦАМ»

15 красавіка 2016 года ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц адбылася прэзентацыя кніг Мікалая Васільевіча Елянеўскага «Радкі, напісаныя сэрцам». Мікалай Васільевіч – таленавіты пісьменнік і журналіст, майстар дакументальнай прозы, у мінулым - рэдактар газеты "Полесская правда". Ён аўтар шматлікіх аповесцяў і апавяданняў, дакументальнай кнігі «Небесный штурмовик», рамана-хронікі «Время пастыря». Не так даўно пабачылі свет яго дзве кнігі «Сердцебиение» і «Мытари и фарисеи». Чытачы, члены клуба пісьменнікаў “Пінчукі”, сябры, калегі і родныя ўспаміналі Мікалая  Васільевіча. Жонка Надзея Мікалаеўна і дачка Марыя расказалі як яны рыхтавалі рукапіс да выдання. Юная пераможца абласнога літаратурнага конкурсу




імя В. А. Калесніка сярод дзяцей і юнацтва ў 2015 годзе, унучка пісьменніка, Аня Елянеўская прачытала свой твор, прысвечаны  дзядулі. У сваім выступе адказны сакратар «Полесской правды» Л. К. Рэбкавец распавяла якім Мікалай Васільевіч быў калегам - шчырым, сумленным, гатовым прыйсці на дапамогу ў любую хвіліну. Намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай  работы, культуры і па справах моладзі С. В. Падшывалаў, у мінулым былы ваенны, афіцэр падзяліўся сваімі ўражаннямі аб прачытаным рамане «Мытари и фарисеи», бо яму вельмі блізкія пачуцці і стан галоўных герояў. Сваімі ўспамінамі падзяліліся літаратары М. І. Ляшук, М. У. Кобец і М. П. Башчук, яны ведаюць і памятаюць Мікалая Васільевіча не толькі як журналіста, пісьменніка, але і як чалавека з адкрытай і светлай душой.

## ТЭМАТЫЧНЫ ВЕЧАР «ЖЫЦЦЁМ ПАСПЕЙ ДАБРО ТВАРЫЦЬ...»

У ліпені на эмацыянальным пад’ёме ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц адбыўся тэматычны вечар «Жыццём паспей дабро тварыць...». Ганаровым госцем вечара быў ветэран-меліяратар, аўтар ўрачыстага гімна меліяратарам, паэт, член клуба пісьменнікаў Піншчыны "Пінчукі" Міхаіл Паўлавіч Башчук. Вядучыя пазнаёмілі з жыццём і творчасцю М. П. Башчука.



На вечары прагучалі вершы аўтара, гімн меліяратараў у выкананні народнага хора Аснежыцкага раённага Цэнтра культуры і вольнага часу. На мерапрыемстве выступілі, пажадалі здароўя і творчых поспехаў Міхаілу Паўлавічу члены клуба літаратараў "Пінчукі": былы калега, меліяратар І. М. Карогвіч, Г.І. Лазіцкая, Ж. Я. Завацкая. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Іванавіч Шушко прачытаў свой верш, прысвечаны М. П. Башчуку.

## ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР «НАСТАЎНІК. ПАЭТ. ГРАМАДЗЯНІН»

Супрацоўнікі ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц правялі ў Калавуравіцкай яслі-сад – сярэдняй школе літаратурны вечар «Настаўнік. Паэт. Грамадзянін», прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння Алеся Бібіцкага.

Алесь Бібіцкі – настаўнік, таленавіты паэт, аўтар шматлікіх публікацый, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Адкрыў мерапрыемства і падзяліўся сваімі ўспамінамі аб Алесе Бібіцкім старшыня Калавуравіцкага сельвыканкама У. У. Наўныка. Перад прысутнымі выступіў дырэктар Калавуравіцкай яслі-сад-сярэдняй школы Я. М. Вакуліч. Цікавым было выступленне-ўспамін аб сумеснай працы ў Плошчаўскай школе былога намесніка дырэктара Зянюціча У. Г. На мерапрыемстве прысутнічалі члены клуба літаратараў “Пінчукі”. Перад прысутнымі выступіў



член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Расіі Валерый Фёдаравіч Грышкавец, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Шушко, Марыя Іванаўна Ляшук, а таксама пісьменнікі Савіла Зінаіда Ўладзіміраўна, Галіна Лазіцкая, Мікалай Пятровіч Жукаў. На працягу літаратурнага вечара гучалі вершы Алеся Бібіцкага, прысвечаныя роднаму краю, у выкананні вучняў школы.

## ВЕРАСНЁЎСКАЕ ПАСЯДЖЭННЕ
## КЛУБА ЛІТАРАТАРАЎ ПІНШЧЫНЫ “ПІНЧУКІ”



На вераснёвым паседжанні творчая супольнасць папоўнілася новым удзельнікам Віктарам Сяргеевічам Мяцельскім, ён пазнаёміў прысутных са сваёй творчасцю.

Члены клуба Лідзія Кучынская, Зінаіда Савіла, Васіль Алешка, Жана Завацкая, Галіна Лазіцкая, Людміла Шклёда прачыталі свае новыя творы. Члены клуба пад кіраўніцтвам старшыні Марыі Іванаўны Ляшук адзначылі далейшыя творчыя планы. У ліку іншых пытанняў разглядалася прапанова пра выпуск хуткім часам у бібліятэцы зборніка твораў паэтаў на грунце новых твораў літаратараў, а таксама пра прыцягненне новых аўтараў у творчы працэс.

## КАСТРЫЧНІЦКАЕ ПАСЯДЖЭННЕ
## КЛУБА ЛІТАРАТАРАЎ ПІНШЧЫНЫ “ПІНЧУКІ”



У пачатку вечара атрымалі віншаванне ад калег па пяру тыя аўтары, чые работы ўбачылі свет на старонках друкаваных выданняў упершыню.

Затым новыя члены клуба літаратараў дэкламавалі свае вершы прысутным. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі таксама планы сваіх сустрэч, выступленняў і мерапрыемстваў клуба літаратараў на бліжэйшы час.

## БЕНЕФІС ЛАПАЦІНСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ-МУЗЕЯ А. БЛОКА

У лістападзе да 70-годдзя з дня стварэння Лапацінскай бібліятэкі-музея А. Блока быў прысвечаны бенефіс. Усе гэтыя дзесяцігоддзі бібліятэка служыць кнізе і чытачу, робіць жыццё землякоў духоўна і інтэлектуальна багацей і разнабаковей.

На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы Лапацінскай сярэдняй школы, якія з'яўляюцца сталымі ўдзельнікамі бібліятэчных мерапрыемстваў, прымаюць удзел у раённых аглядах-конкурсах, з'яўляюцца членамі клуба па інтарэсах пры бібліятэцы. Са словамі віншавання выступіла дырэктар школы Загорцава Таццяна Сафронаўна. Вучні для юбіляра падрыхтавалі музычны нумар-віншаванне.




Дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Алёна Іванаўна Анташук пажадала працаўнікам бібліятэкі творчых поспехаў і добрых чытачоў, а таксама ўручыла ганаровыя граматы і падарунак.

Навуковы супрацоўнік музея А. Блока Жукаў Н.П., член клуба літаратараў Піншчыны, падарыў чытачам верш уласнага складання.

З вялікім задавальненнем завіталі на бенефіс бібліятэкі члены клуба літаратараў “Пінчукі”, якія пасля заканчэння мерапрыемтва наведалі музей Аляксандра Блока.

## КЛУБ ЛІТАРАТАРАЎ ПІНШЧЫНЫ “ПІНЧУКІ” АБМЕРКАВАЛІ ПЛАНЫ НА БУДУЧАЕ

Напярэдадні навагодніх свят ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц адбылося чарговае паседжанне клуба літаратараў Піншчыны «Пінчукі».

На пасяджэнне суполкі завіталі члены клуба аўтарскай песні «КАП-ля» Аляксей і Вольга Шаўчук, Таццяна Гарбат, якія пазнаёмілі са сваёй творчасцю.

Перад прысутнымі выступіла старшыня клуба Марыя Іванаўна Ляшук. Літаратары абмеркавалі планы на будучыню, выказалі прапановы з нагоды хуткай працы.

У прыватнасці, разгледзелі магчымасць правядзення іх творчых сустрэч у цэнтральнай раённай бібліятэцы. Як паведаміла дырэктар бібліятэкі А. І. Анташук, ёсць задумка выдання першага зборніка вершаў літаратараў.

На творчым вечары свае вершы прадставілі Анатоль Козіч з в. Гарадзішча і Марына Лапушка з в. Пачапава. Анатоль Козіч – медыцынскі работнік, які прымаў удзел у паэтычнай сустрэчы «О вечном и человечном» ў Мінску, арганізаваную прафсаюзам медыцынскіх працаўнікоў Беларусі. Па выніках гэтай сустрэчы быў выдадзены зборнік «Стихи работников здравоохранения Республики Беларусь», куды ўвайшлі і творы нашага земляка. Гэту складанку Анатоль Козіч падарыў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі  Янішчыц.

Фінальная сустрэча года членаў клуба "Пінчукі" атрымалась цёплай і душэўнай. Мусіць, сказалася прыбліжэнне светлых і вясёлых свят. Літаратары Піншчыны чыталі свае вершы, спявалі песні пад акампанемент Віктара Мяцельскага і Аляксея Шаўчука. Прыемным момантам сустрэчы стала віншаванне Валерыя Грышкаўца з днём нараджэння. Дырэктар бібліятэкі А.І. Анташук уручыла Валерыю Фёдаравічу невялікі падарунак, а члены клуба «КАП-ля» выканалі для яго песню на вершы Галіны Лазіцкай і музыку Аляксандра Жуковіча.

Цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц - своеасаблівы салон сустрэч з мясцовымі паэтамі, месца, дзе праводзяцца літаратурныя вечары, прэзентацыі кніг, паэтычныя гадзіны, агляды творчасці, вечары-партрэты, а клуб літаратараў Піншчыны "Пінчукі" з'яўляецца своеасаблівым брэндам бібліятэкі. Менавіта таму, на 2017 год у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц штомесячна запланавана мноства цікавейшых мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю творчасці знакамітых беларускіх і мясцовых аўтараў: літаратурны вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Г. В. Марчука, кніжная выстава-агляд да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы, літаратурны вечар да 105-годдзя з дня нараджэння М. Танка "Максім Танк - паэт магутнага і паэтычнага таленту", літаратурны вечар, прысвечаны творчасці Я. Янішчыц "Паэзія душы, кахання і ўспамінаў", прэзентацыя кнігі А. Ігнацюк "Будзе ўсё наадварот", вечар-партрэт "Я поэт, я невольник судьбы", прысвечаны барду, паэту Піншчыны М. Жукаву, вечар-сустрэча з пісьменнікам З. Прыгодзічам "Айчыну сілкуюць асобы", вечар-сустрэча з паэтэсай Г. Лазіцкай, прэзентацыя кнігі С. Барана "Взгляд", вечар-сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Расіі і Беларусі В. Грышкаўцом.

Створаны 15 сакавіка мінулага года клуб літаратараў Піншчыны "Пінчукі" налічвае ужо больш за 30 чалавек і пастаянна папаўняецца новымі аўтарамі. А цэнтральная раённая бібліятэка імя Яўгеніі Янішчыц заўсёды будзе садзейнічаць папулярызацыі творчасці паэтаў Піншчыны.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 481 ад 23 снежня 2016 г. 2017 год быў абвешчаны Годам навукі ў Рэспубліцы Беларусь. Правядзенне Года навукі будзе спрыяць выкананню заданняў узаемадзеяння навукі з культурнай сферай, стварэнню спрыяльных умоў у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц для стварэння і захавання навуковага  і культурнага патэнцыялу.



# Сценарий районного литературного праздника "Якуб Колас і Палессе"

# к 135-летию со дня рождения Якуба Коласа



***Афармленне залы:*** актавая зала і сцэна афармлены ў нацыянальным стылі: беларускі арнамент, ручнікі. На авансцэне - кветкі. На сцэне - партрэт Якуба Коласа, перавіты гірляндамі з кветак, пад ім даты - 1882-1956, вышэй лічба 135.

У фае прадстаўлены кніжныя выставы:

*Кніжна-ілюстрацыйная выстава* "Якуб Колас: пясняр зямлі беларускай".

Кнігі Коласа нам
і калыскай, і школай былі.
І на новай зямлі
нас у сённяшні дзень прывялі.

*П. Панчанка*

*1раздзел* - Палескі след класіка *(творы Я. Коласа, напісаныя на Палессі і аб Палессі*).

2 *раздзел* - Дум народных валадар *(творы Я. Коласа*).

3 *раздзел* - Жыццё і лёс народнага песняра *(літаратурныя і крытычныя матэрыялы аб жыцці і творчасці Я. Коласа*).

*Кніжная выстава* "Галасы палескіх крыніц".

*Выстава работ народных майстроў* "Майстэрства рук і сэрца".

*Для правядзення літаратурнага свята неабходна 2 вядучых, 5 чытальнікаў, выканаўцы песень.*

*У фае Пінкавіцкага цэнтральнага сельскага дома культуры гучыць народная музыка ў выкананні калектыва Пінкавіцкай ДШМ.*

*У зале гучыць беларуская народная музыка. Музыка сціхае, на фоне відэакліпа саліст выконвае песню "Мой родны кут…"(Словы Я. Коласа, музыка І. Лучанка).*

*На сцэну выходзяць вядучыя ў нацыянальных касцюмах.*



**Вядучы 2.** Добры дзень, паважаныя чытачы, госці, гледачы!

**Вядучы 1.** Мы рады сустрэчы з вамі на нашай славутай Пінкавіцкай зямлі. А сабраліся мы для таго, каб ушанаваць памяць вялікага беларускага пісьменніка Якуба Коласа, у сувязі з 135-гадавінай з дня нараджэння.

**Вядучы 2.** Запрашаем на сцэну і прадстаўляем слова для ўрачыстага адкрыцця свята намесніку старшыні райвыканкама Д. Г. Палхоўскаму. Калі ласка, вам слова.

*Выступленне*

**Вядучы 2.** Палессе. Піншчына. Пінкавічы. Менавіта тут жыў і працаваў амаль на працягу шасці гадоў наш славуты паэт, празаік, драматург і вучоны, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі, акадэмік Якуб Колас. Гэта быў плённы перыяд і ў творчым і ў асабістым яго жыцці. Палескія ўражанні пісьменніка знайшлі глыбокае мастацкае ўвасабленне ў яго літаратурных творах.

**Вядучы 1.** Колас! Колькі філасофскага сэнсу і цеплыні ў гэтых простых словах! Жытні Колас - гэта хлеб, гэта аснова чалавечага жыцця, матэрыяльнае багацце чалавека. Але не хлебам адзіным жыве чалавек. У вольны ад працы час яму патрэбны духоўныя багацці - музыка, танцы, песні, кнігі…

**Вядучы 2.** Канстанцін Міхайлавіч свой псеўданім звязаў з жыццём народа, з селянінам, з родным краем і зямлёю, як найглыбейшай крыніцай, дзе ён чэрпаў філасофскія думы, тэмы, вобразы сваіх твораў.

**Чытальнік 1.**

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я.

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя смутнай красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,

Песня магутных дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

*Колас, Я. Родныя вобразы: [верш] / Я. Колас // Збор твораў. Вершы. 1898-1910 . – Мінск, 2007. – Т.1. – С. 224.*

**Вядучы 2.** Нарадзіўся Якуб Колас 3 лістапада 1882 года ў засценку Акінчыцы недалёка ад Стаўбцоў у сям'і лесніка. Тут, у маляўнічых мясцінах Акінчыц, Альбуці, Смольна, на беразе Нёмана прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады будучага паэта.

**Вядучы 1.** З дзяцінства Якуб Колас захапляецца кнігамі. У пастушковай сумцы заўсёды была кніга Крылова, Гогаля, Лермантава ці Някрасава. Асабліва любіў чытаць Мікалая Гогаля "Вечары на хутары бліз Дзіканькі". У 12 год Канстанцін Міхайлавіч піша свой першы верш "Вясна", за што бацька даў яму гасцінец - ганарар рубель.

**Вядучы 2.** Пасля заканчэння Мікалаеўшчынскай школы Міхал Казіміравіч пасылае сына ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую ён паспяхова скончыў у 1902 годзе. Атрымаўшы дыплом народнага настаўніка. Восенню Канстанцін Міхайлавіч спачатку едзе ў Люсіна Пінскага павета працаваць настаўнікам, а потым - у Пінкавічы.

**Вядучы 1.** "Я толькі ўступіў тады ў жыццё", - піша Якуб Колас, - і сваю работу сельскага настаўніка лічыў самай пачэснай. Перада мною стаяла вялікая і адказная задача - усімі сіламі, усім сэрцам служыць працоўнаму народу".

**Вядучы 2.** Ішоў час. Наладзілася работа ў школе. Дзеці ахвотна наведвалі сваю школу, ім спадабаўся новы настаўнік.

*Тэатралізацыя ўрыўка з трылогіі Я. Коласа "На ростанях"*
*(Малоткавіцкая і Калавуравіцкая СБ)*
*Колас, Я. У палескай глушы / Я. Колас // Трылогія. На ростанях. Кніга першая і другая. – Мінск, 1996. – Т.13. – С.7-9.*

**Вядучы 1.** Якуб Колас піша ў сваёй аўтабіяграфіі: "Радыкальныя газеты, сустрэчы з перадавой інтэлігенцыяй накіравалі мяне на рэвалюцыйны шлях. У 1905 годзе я быў ужо заўзятым ворагам самадзяржаўя і ў гэтым напрамку вёў адпаведную работу". Восенню 1905 года да яго прыйшлі сяляне вёскі Пінкавічы, каб ён дапамог ім вярнуць іх балоты і азёры, якія захапіў сабе пан Скірмунт. Канстанцін Міхайлавіч ахвотна адклікнуўся на іх просьбу і напісаў "Предьявленне его высокоблагородню Сигизмунту Сигизмунтовичу Скирмунту от крестьян села Пинковичи».

**Вядучы 2.** Мясцовыя ўлады аднесліся да гэтага "предьявления" устрывожана. Настаўнікам зацікавіўся земскі начальнік, інспектар народных вучылішч, спраўнік паліцыі і нават сам губернатар Мінскай губерні Курлоў. 12 снежня 1905 года ён пісаў пінскаму спраўніку: «Прошу проверить факты о выступлении крестьян села Пинковичи против захвата земель помещика Скирмунта и в случае подтверждения фактов немедленно арестовать учителя Мицкевича». Далей па матэрыялах гэтага здарэння Я. Коласам было напісана апавяданне "Бунт" і эпізод у аповесці "У глыбі Палесся".

**Вядучы 1.** Да работы Канстанціна Міхайлавіча не дапусцілі, а мерай пакарання быў перавод яго ў Верхменскае вучылішча Смалявіцкага раёна.

**Вядучы 2.** Пінкавіцкі перыяд займае важнае месца ў біяграфіі паэта. Менавіта ў Пінкавічах бярэ пачатак літаратурная дзейнасць Я. Коласа, і менавіта тут паэт шліфуе свой педагагічны талент. Тут ён пісаў вершы па-руску з паметкай "село Пинковичы". Усе яны, а іх каля 20, датуюцца 1905 годам.

**Чытальнік 2.**

Развернулась даль немая
Под завесой голубой,
Даль убогая, родная,
Вся залитая тоской.

Старцы-дубы — великаны,
Стали мощною стеной,
Не проносятся туманы
За заветною чертой.

Словно дым волнистый, тонкий,
Льются бойкие ручьи,
Чтоб пробить во все сторонки
Богом данные пути.

А мужицкая дорога
Нитью серою легла

И простору-то у Бога,
Ширины не заняла.
Ярко чудится сиянье.
Бледен луч родной глуши,
Как стыдливое молчанье
Неиспорченной души.

*20 ноября. с. Пинковичи*

*Колас, Я. Пред рассветом: [верш] / Я. Колас // Збор твораў. Вершы. 1898-1910 . – Мінск, 2007. – Т.1. – С. 384-385.*

**Вядучы 2.** На новым месцы Канстанцін Міхайлавіч не адказваецца ад сваіх вольналюбівых поглядаў, у 1906 годзе прымае ўдзел у настаўніцкім з'ездзе, за што яго судзілі і далі 3 гады турмы.

**Вядучы 1.** Новая старонка жыцця Якуба Коласа на Палессі звязана з паслятурэмным перыядам. У маі 1912 года яго накіравалі на работу ў Купяціцкую школу, а восенню перавялі ў Пінск. Колас уладкаваўся на пасаду выкладчыка старэйшага аддзялення двухкласнага прыходскага мужчынскага вучылішча №3. Дзеля папраўкі матэрыяльнага становішча дае прыватныя ўрокі дзецям чыгуначнікаў, духавенства.

**Вядучы 2.** У 16-гадовым узросце прыехала ў горад Пінск на выкладчыцкую працу юная настаўніца з Вільні Марыя Каменская. Душу і сэрца аддавала яна сваім маленькім выхаванкам - вучаніцам жаночага вучылішча пры станцыі Пінск. Жыла на кватэры ў фельчара Галоўных майстэрняў Палескай чыгункі ў Пінску Арсенія Аляксандравіча Балевіча і яго жонкі Ніны Іванаўны разам са сваёю каляжанкаю - настаўніцаю чыгуначнай школы.

**Вядучы 1.** Недалёка кватараваў і Колас. Па словах малодшага сына Якуба Коласа Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча, пазнаёміліся яго бацькі на педагагічнай нарадзе, дзе Канстанцін Міхайлавіч выступаў перад калегамі-педагогамі і позірк яго раз-пораз спыняўся на мілавідным тварыку маладзенькай выкладчыцы. Праз некаторы час, 3 чэрвеня 1913 года 31-гадовы павятовы настаўнік, малады літаратар і 22-гадовая выкладчыца пабраліся шлюбам. Восенню 1914 года ў Коласа нарадзіўся першынец - сын Даніла, у будучым заслужаны дзеяч культуры БССР, дырэктар музея свайго бацькі.

*Тэатралізацыя верша Я. Коласа "Песня над калыскай" (Бабрыкоўская СБ)*

*Колас, Я. Песня над калыскай / Я. Колас // Збор твораў. Вершы. 1898-1910. – Мн., 2007. – Т.1. - С.174-175.*

**Вядучы 2.** Гэты перыяд для Якуба Коласа быў багаты і ў творчым плане: у 1912 годзе выходзіць зборнік "Апавяданні", у 1914 годзе - "Родныя з'явы", навелы "Нёманаў дар", "Малады Дубок", "У старых дубах", піша раздзелы "Новай зямлі" і "Сымона-музыкі". Але многія задумы засталіся не закончаны - пачалася руска-германская вайна. Яго прызываюць у армію.

**Вядучы 1.** Сувязь Якуба Коласа з Піншчынай надоўга спыняецца. Але ў думках сваіх не раз ён будзе сюды вяртацца, напіша апавяданні "Бунт", "Пісаравы імяніны", "Тоўстае палена" і іншыя. Сваю любоў да гэтага краю ён выкажа ў вершы "Палессе", напісаным у 1916 годзе ў Пермі, дзе ён вучыўся ў Аляксандраўскім ваенным вучылішчы.

**Чытальнік 3.**

Край лясоў, край балот
І туманаў гнілых!
Хоць і бедна ў табе,
Хоць у лозах тваіх
Вецер жудасна ўвосень шуміць,
А ўсё міл ты мне...
Чым? Я не ведаю сам,
А твой вобраз маім
Прыглядзеўся вачам,
Да цябе маё сэрца ляжыць.
Я люблю твой прастор,
Гмах шырокі балот,
Дзе бубняць бугаі,
Дзе красуе чарот
І дзе травы, як мора ляглі.
Калі лес там, дык лес:
Можна тыдзень дыбаць;
А прастор, дык прастор –
І канца не відаць,
Не ахопіш, не змерыш зямлі.
Я люблю твой спакой,
Яснасць ціхіх дзянькоў,
Залаценькі ўбор,
Тую чырвань лясоў,
Што на сонцы ўвосень гарыць.
Я далёка цяпер
Ад палескіх раўнін,
А люблю ж я той край,
Бы яго родны сын,
І па ім маё сэрца баліць.

*Колас, Я. Палессе: [верш] / Я. Колас // Збор твораў. Вершы. 1911-1938. – Мінск, 2007. – Т.2. – С. 73.*

**Вядучы 2.** Адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя. Якуб Колас вяртаецца ў Мінск і займаецца выключна літаратурнай дзейнасцю. У пачатку 20-х гадоў адзін за другім выходзяць з друку яго творы:

**Вядучы 1.** “Новая зямля”.

**Вядучы 2.** “Сымон-музыка”.

**Вядучы 1.** “У палескай глушы”.

**Вядучы 2.** “У глыбі Палесся”.

**Вядучы 1.** “На прасторах жыцця”.

**Вядучы 2.** “Дрыгва” і іншыя творы.

*Тэатралізацыя ўрыўка з аповесці Я. Коласа “На прасторах жыцця” (Дамашыцкая СБ)*

*Колас, Я. На прасторах жыцця / Я. Колас // Збор твораў. Аповесці. – Мн., 1972. – Т.12. - С.36-38.*

**Вядучы 1.** У 1926 годзе Якубу Коласу прысвойваецца ганаровае званне народнага паэта Беларусі.

**Вядучы 2.** Ён удастоен пяці ордэнаў Леніна.

**Вядучы 1.** Яго творы былі адзначаны дзяржаўнымі прэміямі БССР і СССР.

**Вядучы 2.** З вялікай радасцю ў 1939 годзе ён успрыняў вестку аб далучэнні Заходняй Беларусі да Усходняй і гэтай гістарычнай падзеі прысвяціў верш “Свайму народу”.

**Чытальнік 4.**

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою,
Сотні новых і ясных дарог
Рассцілае жыццё прад табою!

Новай доляй узыходзіць зара,
Будзеш жыць ты без панскай апекі:
Адышла, адцвіла іх пара,
І панам не вярнуцца вавекі.

Паглядзі, як прасторна наўкруг,
Як прыціхлі палацы, касцёлы!
Тваё ўсё: гэта поле і луг,
У палацах будуй сабе школы.

Ідзі ж смела і ясна ўпярод
Разам з намі дарогай адзінай:
Да вышыняў вядзе свой народ
Наша партыя простай пуцінай.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою,—
Многа новых, шчаслівых дарог

Рассцілае жыццё прад табою!

*Колас, Я. свайму народу: [верш] / Я. Колас // Збор твораў. Вершы. 1939-1945. – Мінск, 2008. – Т.3. – С. 25-26.*

**Вядучы 1.** Важнай падзеяй у гісторыі Пінкавіцкай школы быў 1952 год. Указам прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у сувязі з 70-годдзем народнага паэта Беларусі Пінкавіцкай сярэдняй школе прысвойваецца імя Якуба Коласа. Настаўнікі школы, грамадскаць вёскі цёпла павіншавалі свайго настаўніка з Днём нараджэння. І вялікая падзея была ў школе і вёсцы, калі атрымалі пісьмо-адказ ад Канстанціна Міхайлавіча. Яго чыталі на агульных і класных сходах, у клубе і на сесіі сельскага савета.

**Вядучы 2.** У 1956 годзе паэта не стала. Гэта была вялікая страта для беларускага народа. Для ўвекавечання памяці народнага паэта Якуба Коласа Урад Беларусі выдае ўказы аб прысваенні імя народнага паэта вуліцам, плошчам, культурным установам і арганізацыям. Але найлепшым помнікам Якубу Коласу будуць яго кнігі - “На ростанях”, “Новая зямля”, “Сымон-музыка”, “Дрыгва”, “На прасторах жыцця” і іншыя.

**Вядучы 1.** На Піншчыне свята зберагаюць памяць аб выдатным сыне беларускага народа: на будынку былога прыхадскога вучылішча па вуліцы Чыгуначнай і на доме, дзе ён жыў у Пінску ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі. На званіцы Варварынскага сабору ў Пінску ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць пра шлюб акадэміка Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча і Марыі Дзмітрыеўны Каменскай. Ёсць у горадзе і вуліца Якуба Коласа. У мясцовым музеі Беларускага Палесся захоўваюцца дзесяткі экспанатаў, звязаных з жыццём і творчасцю паэта. Пінскай гарадской дзіцячай бібліятэцы прысвоена імя Якуба Коласа.

**Вядучы 2.** Старэйшая вуліца ў Пінкавічах носіць імя Якуба Коласа. У будынку Коласаўскай школы працуе народны літаратурны музей паэта. На Лунінецкай вуліцы ўстаноўлены прыгожы ўказальны знак з барэльефам паэта да літаратурна-краязнаўчага музея Я. Коласа.

**Вядучы 1.** "Кнігі Коласа нам і калыскай і школай былі", - гэтыя словы з верша Пімена Панчанкі паўтараюць і будуць паўтараць з цеплынёй і ўдзячнасцю новыя пакаленні.

**Вядучы 2.** Неўміруча літаратурная спадчына Якуба Коласа. Пясняр зямлі беларускай у сваіх думках і ў сваіх творах паэт вельмі часта звяртаўся да нашага краю. І мы ганарымся, што ў нашых мясцінах жыў і працаваў народны паэт.

**Чытальнік 6.** Цябе ўспамінаем мы сёння
За ўсё тваё чалавечае,
Што сеяў між нашых дзядоў –
Разумнае, добрае, вечнае.

Ты жыў, працаваў у нашай школе,
Каб свет адкрываць для дзяцей.
Знаходзіў сцяжынку жывую
Да простых палескіх людзей.

Любіў ты палескія пушчы
Зялёных абшараў балот,
Яго працавіты і сціплы
Спрадвеку руплівы народ.

К табе за парадай у школу
Ішоў паляшук, родны Колас,
Каб словы надзеі пачуць,
Пачуць твой праўдзівы голас.

І ў пятым ён годзе гучаў.
У ім былі грозны матывы –
Ён клікаў палескі народ
Змагацца за лёс свой шчаслівы.

І голас твой з даўняй пары
Заве нас да лепшае долі,
Гучыць са старонак кніг
І шлях асвятляе да волі.

*Іван Калоша. Якубу Коласу.*

**Вядучы 1.** Гэты верш напісаў Іван Калоша. Былы кіраўнік літаратурна-краязнаўчага музея Я. Коласа, які зрабіў усё, каб памяць аб паэце жыла вечна на Пінкавіцкай зямлі.

**Вядучы 2.** А зараз слова прадастаўляецца былому кіраўніку народнага літаратурна-краязнаўчага музея Я. Коласа Ніне Рыгораўне Палавец. Калі ласка!

*Выступленне*

**Вядучы 2.** На наша свята завіталі госці, аддаць даніну павагі Якубу Коласу прыйшлі знакамітыя паэты Піншчыны, члены клуба літаратараў “Пінчукі”.

*Выступленне*

**Вядучы 2.** Дарагія госці! вашай увазе прадстаўляецца выступленне лялечнага гуртка “Татошкі”, што працуе пры Парахонскай сельскай бібліятэцы.

*Выступленне лялечнага гуртка “Татошкі” “Дзед і мядзведзь”*

*Колас, Я. Дзед і мядзведзь / Я. Колас // Збор твораў. – Мінск, 2008. - Т.4. – С.246-249.*

**Вядучы 1.** Паэт, празаік, драматург, вучоны, публіцыст - няма, здаецца, у беларускай літаратуры такога жанру, няма ў яе гісторыі такой старонкі, дзе б не ззяла слаўнае імя Я. Коласа, не праявілася б якая-небудзь грань яго шчодрага таленту…

**Вядучы 2.** Хай сад квітнее ў радаснай краіне
Хай шум прасторамі звініць…

**Вядучы 1.** І доўга будзеш ты пад небам сінім
Ісці, співаць, паэт, і жыць, і жыць!

**Вядучы 2.** Паважаныя аматары паэзіі Якуба Коласа! Запрашаем вас наведаць народны літаратурна-краязнаўчы музей Якуба Коласа!

*А.І.Анташук*



# Якуб Колас і Палессе

Я далёка цяпер
Ад палескіх раўнін,
А люблю ж я той край,
Бы яго родны сын,
І па ім маё сэрца баліць…
Я. Колас



Палессе. Піншчына. Пінкавічы. Менавіта тут жыў і працаваў амаль на працягу шасці гадоў наш славуты паэт, празаік, драматург і вучоны, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі, акадэмік Якуб Колас. Пінкавіцкі перыяд займае важнае месца ў біяграфіі паэта. Менавіта ў Пінкавічах бярэ пачатак літаратурная дзейнасць Я. Коласа, і менавіта



тут паэт шліфуе свой педагагічны талент.
Тут ён пісаў вершы па-руску з паметкай «село Пинковичы». Усе яны, а іх каля 20, датуюцца 1905 годам. Гэта быў плённы перыяд і ў творчым і ў асабістым яго жыцці. Палескія ўражанні пісьменніка знайшлі глыбокае мастацкае ўвасабленне ў яго літаратурных творах: апавяданне “Бунт”, трылогія “На ростанях”, верш “Палессе” і іншыя творы. Святкаванне 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа ахапіла ўсю Беларусь. У Пінскім раёне ў цэнтры ўрачыстых свят прайшло раённае літаратурнае свята “Якуб Колас і Палессе”, арганізаванае цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Я. Янішчыц. У вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна сабраліся літаратары, бібліятэкары і вучні Пінкавіцкай сярэдняй школы, каб ушанаваць памяць вялікага беларускага песняра, які ўсімі сіламі і усім сэрцам служыў працоўнаму народу.



Сустракалі гасцей свята музычныя замалёўкі ў выкананні Пінкавіцкай дзіцячай школы мастацтваў. У фае Дома культуры разгарнуліся яскравыя кніжныя выставы “Якуб Колас: пясняр зямлі беларускай”, “Паэзія пінскіх крыніц” і выстава работ народных умельцаў “Майстэрства рук і сэрца”.



Пачалося свята з песні «Мой родны кут…» на словы Я. Коласа. Адкрыў літаратурнае свята намеснік старшыні райвыканкама Дзмітрый Георгіевіч Палхоўскі. Сапраўдным ўпрыгожаннем сталі тэатралізаваныя ўрыўкі з трылогіі «На ростанях», аповесці “На прасторах жыцця”, верша “Песня над калыскай”, вершаванай казкі “Дзед і мядзведзь” у выкананні бібліятэкараў Малоткавіцкай, Калавуравіцкай, Дамашыцкай, Бабрыкоўскай і Парахонскай сельскіх бібліятэк – гледачы з захапленнем глядзелі сцэны жыцця сельскага настаўніка, прыгод дзеда і спеў матулі над калыскай. Са сцэны ліліся мілагучныя беларускія песні і незабыўныя вершы Якуба Коласа. Пра тое як шчыра шануюць памяць аб народным паэце на Піншчыне расказала былы кіраўнік народнага літаратурна-краязнаўчага музея Я. Коласа Ніна Рыгораўна Палавец. Выступілі знакамітыя літаратары Піншчыны — член Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Іванавіч Шушко і член Саюза пісьменнікаў Беларусі Марыя Іванаўна Ляшук. Затым госці свята наведалі народны літаратурна-краязнаўчы музей Якуба Коласа ў Пінкавічах, які знаходзіцца на тым самым месцы, дзе стаяла драўляная школа, у якую ў 1904 годзе прыехаў працаваць яшчэ





невядомы малады настаўнік Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, у будучым народны паэт Беларусі Якуб Колас. Цікавую экскурсію правяла кіраўнік музея Жана Верыч, пад час якой паведаміла пра жыццё паэта на Палессі, пазнаёміла з успамінамі мясцовых жыхароў пра Коласа, яго жыццём.

К.Л.Міхалевіч,
загадчык аддзелам бібліятэчнага
маркетынгу ЦРБ імя Я. Янішчыц




# *Год науки В Логишинской горпоселковой библиотеке*



В настоящее время трудно представить себе библиотеку без компьютерной техники, выхода в интернет. Современные возможности применения компьютерных и интернет-технологий в библиотеке весьма обширны, что позволяет нам применять новые формы работы такие как: видеоуроки, электронные презентации и электронные викторины, виртуальные путешествия, можем озвучивать свои мероприятия – всё это поднимает наши мероприятия на более качественный уровень.

В библиотеке проводились мероприятия, посвящённые Дню белорусской науки, час информирования «Белорусская наука – сегодня и завтра», к Дню космонавтики была оформлена тематическая полка «Человек. Вселенная. Космос», представлена электронная презентация о белорусских космонавтах «Знай наших».



В летний период для младшего и среднего школьного возраста проводились электронно -познавательные викторины: «Тайны природы», «Исторический бумеранг», «Всё обо всём», игра-викторина «Что я знаю о природе», экскурсия – путешествие «Ад старажытнасці да сучаснасці».

В 2017 году Беларусь отмечала одну из важнейших дат своей истории и культуры — 500-летие белорусского книгопечатания.

К юбилейной дате в рамках недели белорусской письменности в библиотеке состоялось виртуальное путешествие «Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай». К этой же дате была оформлена нетрадиционная книжная выставка “Часоў былых і новых повязь”, проведены библиотечно – библиографические уроки “Изобретение бумаги. Первые рукописные книги”, “Информация без границ”, “Белорусские просветители”.




Не оставили без внимания такое событие, как День знаний. В библиотеке была оформлена книжная выставка “За страницами школьного учебника”. Здесь была представлена литература из серии “Жизнь замечательных людей”. Проведена интерактивная игра “Путешествие в страну школярию”.






На протяжении года в библиотеке работала книжная выставка “Беларусь смотрит в будущее”. На выставке были представлены книги, периодические издания, в которых рассказывается об истории науки Беларуси, о создании и работе Национальной Академии наук Республики Беларусь, перспективах дальнейшего развития научных отраслей. Книги из серии «Жизнь замечательных людей» познакомили читателей нашей библиотеки с самыми известными именами и достижениями мировой науки.

Л.И.Гусина,<br>заведующая филиалом<br>Логишинская ГпБ

# Франциск Скорина – духовно-просветительский символ Беларуси

Важнае месца ў рабоце бібліятэк займае папулярызацыя беларускай мовы і нацыянальнай літаратуры сярод чытачоў. Менавіта ў год святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў бібліятэках сістэмы праводзілася шэраг мерапрыемстваў.




500-годдзю беларускага кнігадрукавання быў прысвечаны ўрок ведаў у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яўгеніі Янішчыц "Францыск Скарына - духоўна-асветніцкі сімвал Беларусі", які прайшоў для навучэнцаў 6,8 і 10 класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія №1 імя Ф.Я. Перца г. Пінска». З вялікай увагай дзеці слухалі выступленні мясцовых таленавітых людзей Піншчыны, членаў клуба літаратараў "Пінчукі" Анатоля Козіча, Галіны Лазіцкай і Сяргея Барана. У канцы мерапрыемства вядомы бард Піншчыны Віктар Мяцельскі падарыў вучням песню пра горад Пінск ўласнага складання. Урок ведаў заснаваны на гістарычных і сучасных традыцыях беларускага народа. У гэты ж дзень члены клуба літаратараў «Пінчукі» разам з дырэктарам дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» А. І. Анташук пабывалі на ўрачыстай лінейцы, прысвечанай пачатку навучальнага года ў Дамашыцкай базавай школе, павіншавалі педагогаў, бацькоў і дзяцей з Днём ведаў.



У Лагішынскай гарпасялковай бібліятэцы адбылося падарожжа «Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай". Прысутныя сталі ўдзельнікамі віртуальнага падарожжа па старажытным Полацку, убачылі помнікі архітэктуры, пазнаёміліся са знакамітымі людзьмі, якія жылі і праславілі горад сваёй дзейнасцю.

Для школьнікаў быў праведзены ўрок гісторыі «Перагортваючы памяці старонкі». Бібліятэкары распавялі аб першым кнігадрукару, асветніку, грамадскім дзеячы, вучоным, мастаку, перакладчыку Францыску Скарыне. У бібліятэцы аформлена кніжная выстава "Часоў былых і новых повязь", якая выклікала вялікую цікавасць у юных чытачоў.




У Валішчанскай СБ адбылося свята кнігі "Нас з'яднала слова", пад час якога ўдзельнікі здзейснілі падарожжа ў гісторыю кнігі і даведаліся шмат цікавых фактаў пра жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны, і пра тое, які ўклад унёс беларускі першадрукар у развіццё кнігадруку не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Гістарычны экскурс "Імя славутае ў вяках" прайшоў у Кашавіцкай СБ. Прысутныя пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам першага кнігадрукара Беларусі Ф. Скарыны. У Сошненскай СБ адбылася гадзіна літаратурнага партрэта "У госці да Францыска Скарыны". Вучні старэйшых класаў Сошненскай сярэдняй школы прагортвалі старонкі біяграфіі першадрукара Беларусі і знаёміліся з сусветнай гісторыяй кнігадрукавання. Бібліятэкары Лышчанскай СБ здзейснілі завочнае падарожжа "Ад Буквіцы да Слова", дзе пазнаёміліся з беларускім асветнікам Францыскам Скарынай. У Стытычаўскай СБ адбылося літаратурнае падарожжа "Праз смугу стагоддзяў дайшло да нас слова", у час якога вядучыя пазнаёмілі прысутных з развіццём кнігадрукавання на Беларусі і за яе межамі.



Да юбілейнай даты ў бібліятэках праводзіліся наступныя мерапрыемствы:

- выстава-знаёмства з выданнямі "Святое Евангелле" (Слуцк,1582), Бажэнава В. Дз. "Радзівілы", "Францыск Скарына. Чалавек энцыклапедыя", "Францыск Скарына. Чалавек - легенда" (ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц);
- літаратурны вечар «Невядомы вядомы Скарына» (Парахонская СБ);
- мультымедыйны агляд выданняў Ф. Скарыны (Лагішынская ГпБ);
- урокі гісторыі «Аз, буки, веди», "Светлыя лікі спадчыны" (Каменская, Малоткавіцкая СБ);



- час гісторыі «Позірк праз стагоддзі» (Каўняцінская СБ);
- гістарычны экскурс “У истоков славянской письменности” (Купяціцкая СБ);
- гульня-віктарына «Францыск Скарына і яго час» (Плешчыцкая СБ);
- відэападарожжа “Ф. Скорина – славянский первопечатник и просветитель” (Жыдчанская, Пінкавіцкая СБ);
- літаратурна-гістарычныя экскурсы “Адкуль наш род і наша мова”, “Імя славутае ў вяках” (Чухаўская, Кашавіцкая СБ).

Да Дня беларускага пісьменства Ласіцкая СБ запрасіла вучняў 1-5 класаў Ласіцкай сярэдняй школы на ўрок ведаў “Свято роднай мовы”. Пад час мерапрыемства дзеці даведаліся аб тым, які доўгі і няпросты шлях прайшла беларуская кніга, пашырыліся іх веды пра развіццё беларускага пісьменства і культуры. Віртуальную вандроўку “Летапіс беларускага слова” правяла бібліятэкар Пучынскай СБ для вучняў Пучынскай базавай школы. Прысутнічала 15 чалавек. Гістарычны экскурс “У истоков славянской письменности” адбыўся ў Купяціцкай СБ для вучняў старэйшых класаў Купяціцкай сярэдняй школы. Вядучыя пазнаёмілі прысутных з дзеячамі навукі і культуры, якія стаялі ў вытокаў славянскай пісьменнасці, пра іх дзейнасць у вобласці асветы. З цікавасцю дзеці адказвалі на пытанні гістарычна-пазнавальнай віктарыны “Адкуль да нас прыйшла кніга?”. Бібліятэкар Сошненскай СБ запрасіла сваіх чытачоў на гадзіну роднай мовы “Усіх з’яднала свята слова”, пад час якога паведаміла прысутным пра асветнікаў Беларусі.



Мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання асвятляліся ў сродках масавай інфармацыі і на сайце цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц.

Л.І. Папіціч,
галоўны бібліятэкар
аддзела бібліятэчнага маркетынгу

# Работа с читателями
# в Жидченской сельской библиотеке



Жидченская сельская библиотека - информационно - культурный центр агрогородка “Жидченский”, центр сохранения и популяризации национального духовного наследия, место проведения досуга населения.

Библиотека компьютеризирована, имеется выход в Интернет, что даёт возможность расширить информационное поле читателей.

Ежегодно пользователями библиотеки являются 430 читателей. Основными группами читателей являются дети, молодёжь, сельская интеллигенция, люди пожилого возраста.

При библиотеке успешно работает любительские объединения “Оазис” и “Сяброўка”. Сделать жизнь разнообразнее, интереснее, познакомить с новой информацией по самому широкому кругу вопросов, сохранение и развитие исторического и культурного наследия - вот основные задачи, по которым строит свою работу Жидченская сельская библиотека.

Составной частью деятельности библиотеки является и массовая работа. Основными направлениями работы являются патриотическое и духовное воспитание. Работа по этим направлениям помогает становлению духовного воспитания личности.

Библиотека проводит мероприятия военной тематики. Ежегодно в канун Дня Победы проходит неделя военной книги “Дни воинской славы” и акция “Ветеран живёт рядом”. В рамках акции библиотекари совместно с представителем сельисполкома провели театрализованное представление “Мы помним” и чествование ветерана Великой Отечественной войны Рогальского Серафима Онисимовича.

Библиотекарь для молодёжи организовала обзор выставки-вернисажа “Война на полотнах художников”, где были представлены копии работ белорусского художника М.Савицкого “Цифры на сердце”, “Канада”, Партизанская Мадонна”.

Присоединение к истокам национальной культуры, воспитание моральной культуры и морально здоровой личности - это задачи, к выполнению которых библиотека подходит с ответственностью. В своей работе библиотекари через книгу воспитывают у читателей милосердие, добропорядочность, совесть, формируют культуру поведения. Милосердие и доброта… В последнее время мы чаще стали обращаться к этим словам. Как будто бы начали понимать, что самым острым дефицитом стали у нас сегодня человеческое тепло и забота о ближнем. Цель духовно – нравственного воспитания – научить милосердию, состраданию, стремлению к добру. На эту тему прошли уроки милосердия “Научи своё сердце добру” и “Что такое настоящая дружба”.

С целью организации свободного времени пожилых людей в библиотеке проведены мероприятия “Дзень святых цудаў”, “Што ні край, то звычай” к Дню святой

пасхи, информационный час “Ой рана на Івана”, ”Кулинарный олимп”, “Яблычны спас спяшае ў госці да нас” к православному празднику Преображение Господне. Во время таких мероприятий присутствующие знакомились с правилами поведения в храме, вспоминали праздники и как их отмечали в детстве. Самыми яркими были воспоминания Пасхи и Рождества.

Чтобы воспитать у молодого поколения уважение к наследию своего народа, к историческому прошлому края, представить, как жили наши деды и прадеды в библиотеке ведётся работа по сбору и сохранению фольклорного материала своей местности, написана, и постоянно обновляется летопись своей деревни, формируется краеведческий фонд библиотеки, записываются воспоминания старожилов о деревне, о знаменитых людях, ведётся краеведческая картотека. Все эти материалы представлены на краеведческой выставке “Роднае Жыдча! Край гасцінны і прыгожы”, также представлен краеведческий материал о посёлке в тематических папках и брошюрах “ Родная вёска Жыдча”, “Наш гонар і прыклад - землякі”, «СПК «Невель» в печати», “Спадчына нашых продкаў”, “Герои социалистического труда», “Ветераны Великой Отечественной войны» и др. Этот богатый материал служит справочным материалом и обязательным дополнением к книжному фонду школьникам, учителям, студентам и всем тем, кто интересуется историей своего края.



Всё, что делается в библиотеке, даёт свои результаты. В последние годы увеличился спрос на книги краеведческой и военной тематики, о природе родного края, национальной культуре.

Значимость библиотеки в социализации личности зависит от того, что библиотекарь может предложить подрастающему поколению в плане познания историко-культурных ценностей. Уважение к прошлому страны, родного края, своей семьи - основа воспитания патриотизма. Чтобы знать литературную ниву родного края, надо знать корни литературного наследия, дотронуться до красоты письменности известных писателей – земляков и молодых литераторов.

Сохранить литературное наследие своего края, сберечь своё родное, неповторимое белорусское слово, передать наследникам – цель библиотеки.

Задача библиотеки состоит в том, чтобы кроме чувства любви и ответственности за свою землю и своих близких воспитать в юношестве желание узнать свою историю, заинтересовать их жизнью и подвигами великих людей нашей Родины, и таким образом, с помощью мероприятий привлечь их к чтению соответствующей литературы.

Н.Р. Мосейчук,
библиотекарь 2-й категории Жидченской СБ

# Час духовного общения «Здравствуй, зимушка-зима»

Православные праздники — торжественные дни в Православной Церкви, посвященные празднованию священных событий и особо чтимых святых. По важности воспоминаемых Церковью событий праздники разделяются на Великие праздники, средние и малые. Они различаются между собою торжественностью и чином богослужения.

К Великим относятся рождественские праздники. Рождественские праздники или Святки можно смело назвать самыми любимыми и веселыми. Их с нетерпением ждут и взрослые, и дети. А все потому, что именно с этими праздниками связано множество красивых обрядов и традиций.



История праздника Рождества связана с событием рождения в Вифлееме Иисуса Христа. Это один из самых главных праздников для христиан всего мира. Именно в канун Великих рождественских праздников в ЦРБ имени Евгении Янищиц была организован час духовного общения с Настоятелем храма Рождества Пресвятой Богородицы протоиереем Георгием. На мероприятие были приглашены работники УП «ЭлКис» ОО «БелТиз» и библиотекари. Вызвала интерес книжная выставка «Книги в формате Тифло».



Л.И. Попитич,
главный библиотекарь отдела,
библиотечного маркетинга
ЦРБ имени Евгении Янищиц

# Под знаком милосердия



В 1992 году Генеральной Ассамблеей ООН 3 декабря был установлен Международным днем инвалидов. В этот день мы не только говорим о соблюдении прав и участии инвалидов в жизни общества, но и задумываемся, все ли мы оказываем помощь нуждающимся в милосердии, добром слове. Именно в этот день в Пинковичской сельской библиотеке состоялась акция «Под знаком милосердия». В теплой, доверительной обстановке прошла встреча с иереем Олегом (Миничем), насельником Свято-Елисеевского Лавришевского мужского монастыря. Священник выступил со словом поддержки людей с ограниченными физическими возможностями и рассказал о смысле жизни православного христианина. Жизнь, не имеющая христианского смысла, всегда приводит к духовному кризису, для этого каждому человеку существует необходимость почувствовать свою причастность к миру физическому и духовному. Присутствующим было приятно послушать священника, получить ответы на свои вопросы. В конце встречи гость вручил памятные подарки, привезенные со святых мест. Стремление к полноценной жизни, оптимизм и жизнерадостность людей с ограниченными физическими возможностями являются примером многим здоровым людям. Они радуются жизни, видят красоту, готовы поделиться жизнелюбием со всеми нами. И в этом убедились все присутствующие на праздничном вечере, посвященном Международному дню инвалидов. Активное участие в подготовке и проведении приняла Ирина Анатольевна Полюхович, заведующая Пинковичской сельской библиотеки. Звучали теплые пожелания, песни в исполнении народного ансамбля «Крыніцы», свои стихи дарила библиотекарь Светлана Можаровская. Атмосфера Добра и Милосердия царила в этот день. Акция «Под знаком милосердия» объединила неравнодушных людей в большое доброе событие, дарящее радость, тепло и заботу людям с ограниченными возможностями.



С.Л.Можаровская,
библиотекарь Пинковичской СБ

# Итоговая встреча года клуба литераторов «Пінчукі»

Накануне Нового года в центральной районной библиотеке имени Е.Янищиц состоялось очередное заседание клуба литераторов Пинщины «Пінчукі». Эта встреча была последней в минувшем году и стала своеобразным подведением итогов проделанной работы и составлением планов на будущий год.



В частности, Новый 2018 год знаменателен юбилеями белорусских писателей и поэтов, уроженцев Пинщины, таких как Евгения Янищиц, Валерий Гришковец, Николай Еленевский, Тамара Лознюха, Алексей Ненадовец, Любовь Тарасюк, жизнь и творчество которых стали значительным вкладом в белорусскую культуру. Сотрудниками ЦРБ имени Е.Янищиц будут организованы мероприятия, приуроченные к этим знаменательным датам. В рамках Недели популяризации творчества Евгении Янищиц «Янішчыцкі лістапад» состоится районный праздник поэзии «Непрыручаная птушка Палесся». В ЦРБ пройдут творческий вечер “Я из тех…” к 65-летию со дня рождения Валерия Гришковца, литературный вечер “Слово, обращённое в вечность” к 70-летию со дня рождения Николая Еленевского, вечер-встреча “Свет далёкай мінуўшчыны” к 60-летию со дня рождения Алексея Ненадовца. Также сотрудники библиотеки и литераторы рассмотрели возможность проведения творческих встреч с местными литераторами. Например, в будущем году состоится вечер поэзии Зинаиды Савило «Вся жизнь моя в стихах», вечер бардов Пинщины «Над хваляй Піны ўсхваляваныя», творческий вечер поэта Василия Олешко из д. Молотковичи «Яго лёс – вершы» и встреча с краеведом Татьяной Хвагиной.



Традиционно свое творчество в тот вечер представили Жанна Завацкая, Тамара Шклёда, Галина Лозицкая, Александр Жукович и члены клуба авторской песни «КАП-ля» Алексей и Ольга Шевчук. В этот раз творческая ячейка пополнилась новыми авторами – Оксаной Немезанской, Валентиной Вахитовой, Юлией Водчиц, которые представили свои творения. С пожеланиями вдохновения, плодотворности и новых идей в Новом году выступила директор государственного учреждения культуры «Пинская районная централизованная библиотечная система» Алёна Ивановна Антошук.

Итоговая встреча года членов клуба «Пінчукі» получилась теплой и душевной. Наверное, сказалось приближение светлых и радостных праздников.

Е.Л.Михалевич,
заведующая отделом,
библиотечного маркетинга
ЦРБ имени Евгении Янищиц

## Двери настежь, точно в сказке, хоровод несется в пляске



Стало уже доброй традицией проведение праздников в Домашицкой сельской библиотеке. На этот раз в канун Нового года празднично прошла конкурсная программа «Двери настежь, точно в сказке, хоровод несется в пляске».

В библиотеке собрались дети разного возраста. Их ожидала развлекательная программа: игры, литературные викторины, конкурсы, театрализованное представление сказки «Снегурочка» на новый лад. Ребята, одетые в костюмы героев любимых книг, читали стихи, делились впечатлениями о прочитанных книгах, пели песни, принимали участие в конкурсах и играх. Скучать было некогда. Дети окунулись в атмосферу доброты и светлого праздника, незабываемых впечатлений и хорошего настроения.

Праздник получился замечательный. Селюжицкая София Ивановна, библиотекарь Домашицкой сельской библиотеки поздравила ребят с праздником и поблагодарила читателей, которые отличились в этой программе. Самыми активными были Колесникович Ангелина, Гук Алина, Заяц Анна, Дубинец Ефим, Дубновицкий Андрей, Ермолович Влад.



С.И.Селюжицкая,
библиотекарь 1-й категории
Домашицкая СБ

# С книжкой на колёсах



За 2017 год количество читателей библиобуса составило 503 читателя, в том числе 90 детей. Им выдан 7831 экземпляр литературы, в том числе 709 детской. Посещений – 2531, из них – 433 детских. Осуществлено 120 выездов. Проведено 28 мероприятий.

С целью популяризации литературы были проведены мероприятия, посвящённые литературным юбилеям: литературная викторина «Герои сказок К. Чуковского», посвящённая 135-летию со дня рождения К. Чуковского для учащихся 3-4 классов Борковской средней школы, книжная выставка «Голос и слово Георгия Марчука», посвящённая 70-летию со дня рождения писателя для учащихся Малоплотницкой базовой школы, обзор творчества «Палеская ластаўка» к 69-летию со дня рождения Е.Янищиц для учеников 4-7 классов Малоплотницкой базовой школы.





В рамках патриотического воспитания с жителями д. Тырвовичи была проведена беседа «Война в судьбе моей семьи». Присутствующие вспоминали военное время и какой след война оставила в их семьях.

В целях пропаганды здорового образа жизни был проведён час полезной информации «Быть здоровым – здорово!» для учащихся 7 класса Малоплотницкой базовой школы, распространён буклет «СПИД – мираж или реальность» для жителей деревень Стошаны и Борки.

Ко Дню Чернобыльской трагедии для жителей деревень Сосновичи и Залесье была организована книжная выставка «Чернобыль. Зона отчуждения».

В рамках акции «С книжкой на колёсах» библиотекари ЦРБ им. Е. Янищиц провели игровую программу «Одна радость на всех – детский смех» для учащихся Малоплотницкой базовой школы. Дети с увлечением разгадывали сканворд «Чтение с увлечением», отвечали на вопросы литературной викторины «Путешествие по сказкам». К мероприятию была подготовлена книжная выставка «Лето, книга, я – друзья».

Библиотекарь библиобуса совместно с литературно-поэтической группой «Сузор'е» ЦРБ им. Е. Янищиц и автоклубом «Вестник» отдела идеологической работы, культуры и по делам молодёжи Пинского райисполкома посещают жителей отдалённых деревень в преддверии праздников. Примерами ярких мероприятий стали литературно-музыкальные композиции: «Всё начинается с любви» ко Дню Святого Валентина для жителей д. Выжловичи, «Пасха – свята надзеі і радасці» к празднику Пасхи для жителей деревень Ольшанка и Твердовка, «Великий Май! Победный Май!» ко Дню Победы для жителей д. Тырвовичи, «На крыльях любви к семье и верности» к Международному дню семьи для жителей деревень Вулька Лавская и Клетная, «Святая Троица» для жителей деревень Вешня и Ладорож, «Белая, светлая, чыстая – маці мая Беларусь» ко Дню Независимости Республики Беларусь для жителей деревень Теребень и Липники, «Медовый спас – всё про запас» к празднику Спаса для жителей деревень Невель и Большие Диковичи, «Всё на земле от рук материнских» ко Дню матери для жителей д. Молодельчицы, «Деревенька моя» к празднику деревни Семиховичи, «Осень золото роняет» для жителей деревень Стаховичи и Сосновичи, «Не угасим огонь души» к Международному дню пожилых людей для жителей деревень Житновичи и Завидчицы, «Сила моя в немощи совершается» для жителей д. Залесье, «Пусть будет жизнь прекрасна» ко Дню инвалидов в Жабчицком доме-интернате.









Сейчас, по прошествии уже 8 лет работы библиобуса на селе можно с уверенностью сказать, что цели, которые подразумевал этот замечательный проект уже оправдали те средства, которые были на него затрачены государством.

Н.В.Исаеня,
библиотекарь библиобуса
ЦРБ имени Евгении Янищиц

# Поздравляем с юбилеем!

50

*Гут Аллу Михайловну,*
*заведующую отделом комплектования, обработки и организации единого фонда*

55

*Марчук Елену Юльяновну,*
*библиотекаря Каллауровичской СБ*

60

*Вербанович Елену Владимировну,*
*библиотекаря Купятичской СБ*

*Казак Галину Степановну,*
*библиотекаря Мерчицкой СБ*

***С юбилеем поздравляем!***
***Радости мы Вам желаем,***
***Море жизненных побед,***
***Ангел пусть хранит от бед.***

***Мы желаем Вам удачи***
***И здоровья Вам в придачу.***
***Пусть царит всегда успех,***
***Жизнь пусть будет без помех!***

Паважаныя калегі! Віншуем вас
З найлепшым святам – Новым годам!
Хай новы дзень і новы час
Змяце ў мінулае нягоды!

Вам хочам  шчыра пажадаць,
Каб ззяла ў сэрцах вашых сонца,
А з неба ліўнем благадаць
Благаспрыяла вам бясконца!

Каб зоркі падалі ў руку,
А на стале было да хлеба.
І каб хапала ў кашальку
На ўсе надзённыя патрэбы.

Хай будзе ў сем'ях вашых мір,
І разуменне, і пяшчота,
Каб не нуды – кахання вір
Суправаджаў пачуццяў дотык!

Дай Бог здароў'я вам збанок
Ды й 'шчэ куфэрак весялосці,
Каб не звaліла стома з ног,
Пакуль да вас даедуць госці!

Жадаем удачы вам, святла,
Дабра, спакою, мудрай згоды -
Каб радасць шчыраю была!
Жывіце ў шчасці! З Новым годам!



# СОДЕРЖАНИЕ


| | |
|---|---|
| 1. Анализ работы | 4 |
| 2. Награждение лучших сотрудников | 9 |
| 3. Удзел у Рэспубліканскім конкурсе “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” | 10 |
| 4. Сценарий районного литературного праздника “Якуб Колас і Палессе” | 25 |
| 5. Якуб Колас і Палессе | 36 |
| 6. Год науки в Логишинской горпоселковой библиотеке | 38 |
| 7. Франциск Скорина – духовно-просветительский символ Беларуси | 40 |
| 8. Работа с читателями в Жидченской сельской библиотеке | 43 |
| 9. Час духовного общения «Здравствуй, зимушка-зима» | 45 |
| 10. Под знаком милосердия | 46 |
| 11. Итоговая встреча года клуба литераторов «Пінчукі» | 47 |
| 12. Двери настежь, точно в сказке, хоровод несется в пляске | 48 |
| 13. С книжкой на колёсах | 49 |
| 14. Наши юбиляры | 51 |

Информационно-аналитическое издание
Выпуск ПБЖ подготовлен
отделом библиотечного маркетинга
с участием директора

*Идея, составление* -
*Е.Л.Михалевич*
*Л.И.Попитич*
*Редактор* - *А.И.Антошук*
*Компьютерная вёрстка, дизайн* -
*Е.Б.Ошуркевич*

*Ответственная за выпуск* - *А.И.Антошук*
*Январь, 2018*



225710 г. Пинск, ул. ИПД, 35
тел.: 32 23 66